Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. „ 3 „ — 2 р. — к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капітэрлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок капітэрлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазвалі. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 20 (2208) Аўторак, 24-га студзеня 1928 г.

Хлебазагатоўкі і рынак прамтавараў.

Энэргічныя меры, прынятыя для ўзмацненьня загатовак хлеба і сыравіны, пачалі даваць свае вынікі. Дзесяцідзёнкі загатовак па акругах, якія сёньня друкуюцца ў нашай газэце, сьведчаць аб тым, што тэмп загатовак узмацніўся, што ўрэшце там, дзе належны націск быў зроблены, мы маем пералом настрою загатоўцаў, а таксама і настрою сялянства.

Праўда, хоць яшчэ і ня ўсюды, але мы ўжо маем пералом у сэнсе большай ўвагі каапэрацыі і належных дзяржаўных органаў да справы загатоўкі хлеба і сыравіны. Каапэрацыі ў некаторых мясцох удалося сагнаць прывітніка-спакулянта з загатоўчага рынку і ўзяць у свае рукі справу загатовак.

Значна салідзнічала ўзмацненьню тэмпу загатовак завоз прамысловых тавараў і прэміраваньне імі тых загатоўчых органаў, якія выказваюць больш поспеху ў справе загатоўкі хлеба і сыравіны. Выкарыстаны рэзервы тавараў, якія былі на мясцох, з гораду на вёску пакіроўваецца куды больш тавараў чым раней, зьнішчаны перашкоды фармальнага характару, якія затрымлівалі паступленьне тавараў у крамы вясковай каапэрацыі. Прымаюцца захады да таго, каб зьнішчыць каапэрацыйную практыку накіроўваньня у вёску толькі тых тавараў, якія даюць больш прыбытку. Таксама значны ўплыў на паступленьне хлеба мае і тое, што сялянства затрымлівала ў сябе вялізарныя сумы, якія яго павінна было выплачваць дзяржаве па розным роду падатках, сэдах, страхавых плацяжох і г. д.

Такім чынам, мы зараз на рынку загатовак некаторым чынам дасягнулі пералому. Але было-б няправільным казаць мы ўжо зараз не падагулілі вынікі першага перыяду барацьбы на хлебазагатоўчым рынку. Мы выявілі цэлы шэраг недахопаў і ў нашым хлебазагатоўчым апараце і ў яго рабоце. Наш хлебазагатоўчы апарат пачаў адрывацца ад сялянства, а ў некаторых мясцох справа дастаўкі хлеба на загатоўчыя пункты была так бюракратычна настаўлена, што ў сяляніна проста адпадала ахвота па гэты пункт сьдзіць. Масавая рэвізія, якая ў апошні час была праведзена і просіла і ўсёй нашай грамадзянасьцю, прымусіла загатоўчыя органы зьмяніць тэмп сваёй працы, значна яго паскорыць і за кароткі тэрмін паказаць вынікі, якіх мы ня мелі за цэлую восень і зіму.

Але гэта яшчэ ня значыць, што ў нашым загатоўчым апараце ўсё ўжо абстаіць добра, што ўсе недахопы ўжо зьнішчаны і што ён працуе як сьлед. Тыя весткі, якія штодзень друкуюцца ў газэтах, якраз сьцьвярджаюць адваротнае, і гэта ставіць перад усімі нізавымі і цэнтральнымі арганізацыямі пытаньне аб тым, што тая масавая рэвізія загатоўчага апарату, якую мы пачалі, павінна быць даведзена да канца, каб урэшце пакончыць са ўсімі адмоўнымі зьявамі ў працы нашага апарату.

Трэба абавязкова адзначыць, што каапэрацыйныя арганізацыі, ня гледзячы на значнае ажыўленьне сваёй працы, усё-ж і дагэтуль робяць буйныя памылкі, якія вельмі дрэнна адбіваюцца на тэмпе іх загатоўчай працы. Ня гледзячы на тое, што Наркамгандаль робіць усё магчымае для таго, каб забясьпечыць каапэрацыю прамысловымі таварамі, каапэрацыя на гэтую справу належнае ўвагі слаба зьвяртае. Гэтымі днямі мы друкавалі карэспандэнцыю адносна жалеза, якога Белкаапсаюз у працягу цэлага тыдня ня браў са складу металётросту, сёньня мы зьмяшчаем карэспандэнцыю адносна тэкстыльных тавараў, якіх Белкаапсаюз ня браў са складу тэкстыльсындыкату і якія прымушан быў рэалізаваць у горадзе.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што нашы каапэрацыйныя органы поўнасьцю не зразумелі значэньня завозу прамысловых тавараў для справы загатовак хлеба і сыравіны. У час, як мы адсюль атрымліваем весткі аб недахваце прамысловых тавараў, апошнія затрымліваюцца ў горадзе і не даходзяць да свайго спажыўца.

Усё гэта прымушае ўсіх нас і ў далейшым выказаць максымум энэргіі ў справе загатоўкі хлеба і сыравіны. Ніякім чынам нельга задаволіцца дасягнутымі посьпехамі. Ніякім чынам нельга паслабіць тэмп разгорнутай працы. Барацьбу з бюракратызмам загатоўчых органаў, барацьбу са спэкулянтамі, з кулакамі, з неплацельшчыкамі падаткаў трэба працягваць і ў далейшым, пакуль ня будзе выканан увесь плян, вызначаны нашымі цэнтральнымі органамі.

Загатоўчыя пляны павінны быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін, для гэтага вызначаным.

Кляса проці клясы ў Нямеччыне.

Стачка сярэдня-нямецкіх мэталёўцаў пашыраецца на мэталёпрадпрыёмствы іншых раёнаў.—Каб прымусіць рабочых да здачы, капіталісты абвясьцілі 50.000 мэталёўцаў пад лёкаўтам.—Здрадніцтва меншавікоў.

Прадпрыёмцы лёкаўтавалі 50.000 мэталёўцаў.

У БАРАЦЬБУ ЎЦЯГНУТЫ НОВЫЯ РАЙЁНЫ. — РЭПРЭСІІ САЦЫЯЛ-ЗГОДНІКАЎ ПРОЦІ КАМУНІСТЫЧНА НАСТРОЕНЫХ РАБОЧЫХ.

БЭРЛІН, 21-I. Цэнтральны камітэт саюзу прадпрыёмцаў сярэднянямецкае мэталічнае прамысловасьці на сёньняшнім пасяджэньні ўхваліў абвясьціць з 24 студзеня агульны лёкаўт на ўсіх мэталічных прадпрыёмствах сярэдня-нямецкага райёну. Лёкаўт зьяўляецца адказам прадпрыёмцаў на забастоўку, абвешчаную рабочымі некаторых прадпрыёмстваў.

* * *

БЭРЛІН, 22-I. Лёкаўт рабочых мэталёўцаў сярэдня-нямецкае мэталёвае прамысловасьці ахапляе 50 т. чалавек; апроч таго, лёкаўтавана 4 т. мэталёўцаў і мэталюргічных прадпрыёмстваў Рэйн (Саксонія). Прадпрыёмцы, абвясьціўшы лёкаут, хочуць даць прычыну трацейскім інстанцыям да новага выступленьня з тым, каб была ўхвалена новая трацейская пастанова, якая прадугледжвала б павялічэньне заработку не на 3 пфэнігі, а на 4 ці 5. Прадпрыёмцы дамагаюцца, каб абвешчаньнем новае трацейскае пастановы абавязковаю было адхіленьне патрабаваньня рабочых павялічыць заработак на 15 проц. У даным выпадку прадпрыёмцы сярэдня-нямецкае мэталёвае прамысловасьці хочуць скарыстаць практыку цяжкае прамысловасьці ў Заходнай Нямеччыне ў 1927 г.

Абвешчэньне аб лёкауце выклікала асаблівы ўздым баявога настрою сярод рабочых. Да патрабаваньня павялічыць заработак на 15 проц. далучылася 7 тысяч рабочых мэталюргічных прадпрыёмстваў у Лейпце; рабочыя-ж мэталюргічнага прамысловага райёну ў Вітэнбэрзе ўхвалілі скасаваць 31-га студзеня тарыфную згоду (аб заработку). Абедзьве групы рабочых дамагаюцца ўдзелу ў агульнай барацьбе за заработак мэталёўцаў у Сярэдняй Нямеччыне.

Сацыял-дэмакратычныя і рэфармісцкія лідэры прафсаюзаў на сыходзяць кампаніі проці камуністаў. Дэлегацыя к нфэрэнцыя нямецкага саюзу мэталёўцаў, скліканая галоўным парадкам з мэтаю барацьбы проці камуністаў. Камуністычныя прадстаўнікі мясцовых аддзелаў саюзу, а таксама дэлегаты-камуністы настаўлены рэфармісцкім кіраўніцтвам пад пагрозу дысцыплінарных мер. Гэтая тактыка рэфармістаў мае на мэце правесьці на канфэрэнцыі рэзалюцыю, накіраваную проці кампартыі.

* * *

БЭРЛІН, 21-I. Пад нашымам энэргічнае забастоўкі рабочых мэталюргічнае прамысловасьці Сярэдняе Нямеччыны, міністэрства працы адмовілася ад думкі абвясьціць абавязковаю трацейскую пастанову, ухваленую на канфлікце між рабочымі і прадпрыёмцамі мэталюргічнае прамысловасьці.

Цэнтральны забастоўчы камітэт у Гале заклікае рабочых узмоцнена праводзіць далей барацьбу.

Агульны сход рабочых Штэрэльцу, на якім поўную перамогу мела ізноў левая прафсаюзная меншасьць, ухваліў пашырыць фронт барацьбы і выступіць на тольки за павялічэньне заработку, але і за 8-мігадзінны рабочы дзень. Камуністычная ячэйка заводу „Лейнэвэрк" зьвярнулася да рабочых свайго прадпрыёмства з заклікам таксама далучыцца да барацьбы за заработак, высуноўшы такія-ж патрабаваньні, як і мэталісты Сярэдняе Нямеччыны.

ЗА ЧЫРВОНЫ БАЯВЫ БЛЁК ПРАЦОЎНЫХ.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ Т. ТЭЛЬМАНА Ў ПАРЛЯМАНЦЕ.—УЛЬТРА-ЛЕВЫЯ ПАКАЗАЛІ СЯБЕ СЛУЖКАМІ БУРЖУАЗЕІ.

БЭРЛІН, 21-I. У нямецкім рэйхстазе адбываюцца зараз сэрэчкі па бюджэце. Выступіўшы ў спрэчках прамоўца ад кампфракцыі Тэльман падрабязна спыніўся на клясавым характары бюджэту і падкрэсьліваў, што 75 проц. агульнае сумы падатковых паступленьняў бярэцца з працоўных. Новы бюджэт—праводзіць далейшае скарачэньне выдаткаў на сацыяльныя патрэбы.

Тэльман далей падрабязна спыніўся на становішчы пралетарыяту, асабліва падкрэсьліваючы зьніжэньне рэальнага заработку, далейшы рост беспрацоўя і правядзеньне буржуазным блёкам і прафсаюзнай бюракратыяй палітыкі трацейскіх пастаноў аб прамысловых канфліктах. Адзначыўшы павышаную актыўнасьць рэакцыі на культурна-палітычным фронце, Тэльман зрабіў аналіз імпэрыялістычных тэндэнцый нямецкае буржуазеі і скончыў заклікам проці паставіць блёку трэставанага капіталу і буйнае буржуазеі чырвоны баявы блёк працоўных мас.

Прамова Тэльмана ня раз перапынялася варожымі выгукамі ультра-левых. Гэтыя выгукі кожны раз спаткалі ўхвалу з боку сацыял-дэмакратаў і буржуазных партый.

У панскай Польшчы.

КАРА СЬМЕРЦІ.

Пасьля чатырохдзённай судовай расправы ляндзінскі акруговы суд прыгаварыў Казімера Выдзеўскага, 22 гадоў, за забойства прэзыдэнта г. Лодз Цыкарскага на кару сьмерці праз павешаньне.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ.

21 студзеня г. г. у Варшаве на вул. Дзельнай і Дзікай адбылася, як паведамляе «Газэта Варшавска» (№ 22), камуністычная дэманстрацыя. Былі раскінуты адозвы. Паліцыя разагнала дэманстрацыю.

УКРАІНАФОБСТВА.

ВАРШАВА. У львоўскіх украінскіх колах абураны паводзінамі рэктара львоўскага унівэрсытэту, які выключыў студэнта-украінца з унівэрсытэту за прыход яго ў унівэрсытэт у украінскім нацыянальным галоўным уборы. На грунце нашэньня украінскімі студэнтамі нацыянальных галаўных убораў ужо адбывалася крывавыя сутычкі між польскаю і украінскаю моладзьдзю.

Арышт б. пасла сойму Шапеля.

У Варшаве, учачы з 18 на 19 студзеня г. г., арыштаваны б. пасол сойму з незалежнай сялянскай партыі Шапеля. Шапель арыштаваны з якойсьці «дамай» К. Главацкай.

Гандлёвы балянс у сьнежні.

Гандлёвы балянс Польшчы ў сьнежні 1927 г. прадстаўляецца так: прывезена на 275.896.000 зл., вывезена на 215.433.000 зл., ці дафіцыт у сьнежні раўняецца 60.463 000 зл., ці 35.180.000 залатых франкаў. Вываз у сьнежні ў параўнаньні з лістападам зьменшыўся на 7.986.000 залат. франкаў.

У Заходняй Беларусі.

СУД НАД ПОСТАЎСКІМІ КАМУНІСТАМІ.

19 студзеня г. г. у Віленскім акруговым судзе пачалася справа 21 камуніста, якія былі арыштаваны ў пастаўскім павеце. На судовую расправу выкліканы 19 сьведкаў абвінавачаньня і звыш 100 з боку абароны. Справа працягнецца некалькі дзён.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ АДОЗВЫ.

Уночы з 18 на 19 студзеня ў некалькіх пунктах Вільні расіданы былі камуністычныя адозвы, падпісаныя акруговым выканаўчым к-там кампартыі Зах. Беларусі.

Справа б. пасла сойму Галавача.

Як паведамляе „Кур'ер Віл.", працэс б. пасла Галавача адбудзецца асобна ад справы б. паслоў грамадаўцаў і будзе разьбірацца ў Варшаве. Акт абвінавачаньня будзе яму ўручан на гэтым тыдні, а працэс пачнецца у лютым.

«Народ» Янкі Станкевіча.

Янка Станкевіч, аддзяліўшыся ад «Сельсаюзу» п. Ярэміча і К-о і заснаваўшы сваю ўласную «Сялянскую партыю», стаў выдаваць газэту „Народ". У гэтай сваёй газэце Я. Станкевіч да апошняга часу на вывіў яшчэ сваёй сапраўднай ідэалёгіі, а абмежаваўся толькі крытыкай асоб, з якімі ён пасварыўся. Разглядаючы працу левых беларускіх арганізацый, Я. Станкевіч тлумачыць іх посьпехі у гушчах іх беларускасьцю і г. д.

Но, Я. Станкевіч шкадуе аб сваім разрыве з Ярэмічамі і К-о. І мо' гэта разрыў быў вынікам тэмпераманту, а не прадуманай ідэалёгіі. Тады ня стоіла і пачынаць.

У Заходняй Беларусі.

Канфіскацыя «Сялянскай Нівы».

Урадавы камісар г. Вільні сканфіскаваў сельсаюзьвіцкую газэту „Сялянскую Ніву" за артыкул: «Факты і іх агітацыйнае значэньне".

Новыя газэты на беларускай мове.

У Зах. Беларусі выйшлі гэтымі днямі новыя газэты на беларускай мове: «Беларускі радны», якую выдае видомы «доктар» Паўлюкевіч, і «Самаўрад», якую выдае ў Баранавічах група Міткевіча.

Зьезд беларускіх пчаляроў.

На 24 студзеня г. г. у г. Вільні адбудзецца зьезд беларускіх пчаляроў, які скліча Беларускае Пчаляроскае Каапэрацыйнае т-ва пад назваю «Пчала».

Беспрацоўе ў Віленскім ваяводзтве.

Паводле статыстыкі, колькасьць беспрацоўных у Віленскім ваяводзтве за апошні тыдзень раўнялася 4805 асобам. У апошнім тыдні колькасьць беспрацоўных узрасла на 350 асоб.

* * *

У працягу часу ад 9 да 14 студзеня лік беспрацоўных у Віленшчыне ўзрос на 320 асоб. Агулам на Віленшчыне лічылася на 15 студзеня г. г. 4592 асобы.

Французскі адказ Амэрыцы

НА ПРАПАНОВУ АБ „ВЕЧНЫМ МІРЫ".

ПАРЫЖ, 22-1. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Сёньня агалошан адказ Брыяна Келёгу.

У адказе зазначаецца, што Францыя згаджаецца на прапанову Злучаных Штатаў, каб угавор меў шматбаковы характар, але лічыць, што Злучаныя Штаты павінны ўзяць пад увагу падпісаньне дзяржавамі-сябрамі Лігі Нацый летась у верасьні рэзалюцыі, якая кваліфікуе агрэсыўную вайну міжнародным злачынствам і прапануе вырашаць усе непаразуменьні мірным шляхам.

«Францыя,—зазначана далей у адказе,—гатова дапамагаць натугам Злучаных Штатаў у такой меры, якая сумясьціма з яе міжнароднымі абавязацельствамі.

Францыя в ахвотаю згодзіцца на кожную прапанову, якая дае магчымасьць пагадзіць абсалютную ганьбу ўсякае вайны з абавязацельствамі дзяржаў і іх законнымі клапотамі аб сваёй безапаснасьці»

Правал антысавецкага выступленьня Грына і К-о.

НЬЮ-ЁРК, 21-I. Расейска-амэрыканская гандлёвая палата агалосіла адказ на ліст Уола (віцэ-прэзыдэнт амэрыканскае фэдэрацыі працы), які патрабаваў, каб палата «прымусіла савецкі ўрад спыніць прапаганду ў Злучаных Штатах».

«Палата,—зазначана ў лісьце,—зацікаўлена толькі ў разьвіцьці савецка-амэрыканскіх гандлёвых зносін». Палата далей зазначае, што яе дзейнасьць адпавядае палітыцы міністэрства гандлю Злучаных Штатаў, якое таксама стаіць за патрэбу разьвіцьця савецка-амэрыканскага гандлю. Нарэшце палата адхіляе прапанову Уола аб арганізацыі сакрэтнага нападу фэдэрацыі для разгляду «дакумэнтаў аб савецкай прапагандзе», якія нібы знаходзяцца ў Уола.

Рэпрэсіі за праўду аб СССР.

НЬЮ-ЁРК, 16-1. У Чыкага на мітынзе, сабраўшым больш 1.200 рабочых, з дакладам аб падарожжы ў СССР выступіў Маўрэр, старшыня амэрыканскае прафсаюзнае дэлегацыі, наведаўшае СССР ўлетку 1927 году. Заявы Маўрэра аб посьпехах і трывалым становішчы Савецкага Саюзу, а таксама аб добрых умовах працы рабочых у СССР былі спатканы прысутнічаўшымі на мітынзе рабочымі з захапленьнем.

Да падарожжа ў СССР Маўрэр быў старшынёю фэдэрацыі працы штату Пэнсільваніі. Пасьля звароту яго прымусілі падацца ў адстаўку. Адначасна Маўрэр вызвален ад пасады старшыні навучальнага аддзелу фэдэрацыі.

Адстаўка нарвэскага правага ўраду.

ОСЛО, 21-1. У выніку выбараў у парлямант, якія адбыліся ў кастрычніку 1927 г., сёньня пасьля аднаўленьня парляманцкае сэсіі кансэрватыўны ўрад Люкке падаў каралю просьбу аб адстаўцы.

Увага: парляманцкія выбары ў Нарвэгіі 17-га кастрычніка 1927 г. скончыліся паражэньнем кансэрватыўнае партыі: кансэрватары страмалі 32 мандаты, аграры—26, радыкалы—29, рабочыя дэмакраты—1, рабочая партыя 59 і камуністы—3 (у ранейшым парляманце ў кансэрватараў было 54 мандаты, а ў рабочай партыі—24).

Кабала з 2-х канцоў

ВЕНА, 17-1. Рэпарацыйная камісія згадзілася адмовіцца на карысьць крэдыторам на новай аўстрыйскай пазыцы ад належачага ёй закладнога права на некаторую дзяржаўную маемасьць і пастаянныя крыніцы дзяржаўных прыбыткаў Аўстрыі; за рэпарацыйнай камісіяй захоўваецца толькі права «другое закладное» (г. зн. у выпадку падачы заявы аб спагнаньні закладу, перш-на-перш будуць задаволены крэдыторы па новай пазыцы, а рэпарацыйная камісія будзе задаволена з рэшты сум).

Для набыцьця памянёнага закладнога права крэдыторамі па новай пазыцы патрэбна яшчэ згода Злучаных Штатаў.

Ідэя інда-эгіпецкага супрацоўніцтва.

ЛЁНДАН, 22-1. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Каіру: «Прыехаўшы ў Эгіпэт лідэр індыйскіх свараджыстаў Матылял Нэру паведаўся ў Алазхарскі унівэрсытэт. У прамове сваёй Матылял Нэру заявіў, што мэтаю яго прыезду зьяўляецца жаданьне убачыць вынікі барацьбы эгіпцян за незалежнасьць і дамагчыся згоды між Эгіптам і Індыяй. Ідэя супрацоўніцтва між Індыяй і Эгіптам спаткала водгук спачуваньня ў прамовах прадстаўнікоў унівэрсытэту.

КОНТР-РЭВОЛЮЦЫЙНЫ ТЭРОР НА ПОЎДНІ КІТАЮ.

307 РАССТРАЛЯНЫХ ЗА ДЗЕНЬ

ШАНХАЙ, 22-1. Расстрэлы камуністаў ва Ўхане ня спыняюцца. За адзін толькі дзень 20-га студзеня ва Ўхане расстраляна 307 камуністаў.

У ВОЙСКУ НАСЬПЯВАЕ ПАЎСТАНЬНЕ.

ШАНХАЙ. 22-1. Шанхайская ўлада ня здолела сабраць патрэбнае сумы грошай для новагодняе выплаты пэнсіі войску і чыноўнікам. У зьвязку з гэтым у шанхайскім гарнізоне прыкмячаюцца непарадкі. Улада баіцца паўстаньня ў гарнізоне.

Арышты ў партугальскім Гуандуні.

ШАНХАЙ, 22-1. Водлуг паведамленьняў кантонскае газэты «Мэрчэнтс Дэйлі», улада выспы Макао (партугальская калёнія на поўдні правінцыі Гуандунь) арыштавала некалькі сот чалавек, западозраўшы іх у камуністычнай дзейнасьці.

ПЕРАМОВЫ МІЖ ЧАН-КАЙ-ШЫ І МУКДЭНАМ.

ШАНХАЙ, 22-1. Ганкінскія газэты паведамляюць, што правы кітайскі палітычны дзеяч Ван-Ке-Мін вядзе ў Шанхаі перамовы «аб падпісаньні згоды між Чан-Кай-Шы і мукдэнскай партыяй».

Рост рабочага руху ў Шанхаі.

ШАНХАЙ, 22-1. Рост рабочага руху ў Шанхаі выклікае трывогу буржуазеі. Шанхайская гандлёвая палата дамагаецца, каб улада распусьціла ўсе нават жоўтыя прафсаюзы, абяцаючы ў такім выпадку даць уладзе пазыку ў суме 8 міліёнаў даляраў.

Подкуп нанкінцаў Ракфэлерам.

НЬЮ-ЁРК, 21-1. Агенцтва «Асашыэйтэд Прэс» з Шанхаю паведамляе, што амэрыканскія нафтавыя кампаніі згадзіліся заплаціць нанкінскай уладзе мыты ў разьмеры 60 цэнтаў з кожных дзесяці балёнаў увезеных нафтапрадуктаў, што значна перавышае мыты, вызначаныя ўгаворамі. У зьвязку з гэтым у міністэрстве замежных спраў Злучаных Штатаў зазначаюць, што, наколькі ў даным выпадку мае месца прыватная згода між нафтавымі фірмамі і нанкінскаю ўладаю, дык з пункту гледжаньня міжнародных угавораў проці гэтае згоды пярэчыць нельга.

Япона-савецкія дачыненьні.

ЯПОНСКІ ПРЭМ'ЕР АБ САВЕЦКА-ЯПОНСКІМ ГАНДЛІ.

ТОКІЁ, 21-1. Пасьля новагодніх канікул сёньня адчынілася сэсія японскага парляманту. Прэм'ер і міністр замежных спраў Танака наконт дачыненьняў між СССР і Японіяй заявіў: «Добрасуседзкія адносіны між Японіяй і СССР робяцца ўсё больш прыяцельскімі. Японскія прадпрыёмствы на тэрыторыі савецкага Далёкага Ўсходу разгортваюцца вусім здавальняюча, а савецка-японскія гандлёвыя зносіны характарызуюцца паступовым ростам».

ТАВ. ТРАЯНОЎСКІ Ў ТОКІЁ.

ТОКІЁ, 21-1. Паўнамоцны прадстаўнік СССР у Токіё Траяноўскі, які ў часе ўсяго падарожжа праз Манчжурыю, Карэю і іншыя райёны Японіі сустракаў шчыры прыём, сёньня раніцою прыехаў у Токіё.

Роспуск японскага парляманту.

ТОКІЁ, 21-1. Апазіцыйная партыя Мінсэйто падала ў парлямант вотум недавер'я ўраду. Дзеславая партыя падала прапанову аб неадкладным роспуску парляманту. З прычыны такога становішча, урад распусьціў парлямант сёньня-ж.

РАЗВОДЗЬДЗЕ ДАЛЯРА

НЬЮ-ЁРК, 19-1. Міністэрства гандлю паведамляе, што амэрыканскія капіталісты ў працягу 1927 году ўклалі ў чужаземныя пазыкі капітал у 1.574.960575 даляраў, гэта значыць на 166.405.725 даляраў больш, чымся у 1926 годзе. Найбольшую колькасьць выданых пазык склалі пазыкі асобным урадам.

Тав. Даўгалеўскі ў Брыяна.

ПАРЫЖ. 20-1. Паўнамоцны прадстаўнік СССР у Парыжы т. Даўгалеўскі наведаў міністра замежных спраў Брыяна. Візыт меў афіцыёзны характар, бо вярыцельныя граматы будуць перададзены Даўгалеўскім прэзыдэнту толькі праз некалькі дзён.

Фашысцкія бясчынствы.

ПАРЫЖ, 22-1. Агэнцтва Гаваса паведамляе з Брусэлю: «З прычыны намеру «саюзу нацыянальнае моладзі» (фашысцкая арганізацыя) перашкодзіць дэманстрацыі савецкага фільму ў гарадзкім кіно-тэатры, улада забараніла дэманстраваць фільм».

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

АДКАЗНЫ ВІЗЫТ БРЫЯНА ДАЎГАЛЕЎСКАМУ.

ПАРЫЖ, 23-1. 21-га студзеня Брыян быў у паўнамоцнага прадстаўніка СССР Даўгалеўскага з адказным візытам.

ПАДПІСАНЬНЕ РЫБАЛОЎНАЙ КАНВЭНЦЫІ МІЖ СССР І ЯПОНІЯЙ.

МАСКВА, 23-1. 23-га студзеня у Народным Камісарыяце па Чужаземных Справах была падпісана рыбалоўная канвэнцыя між СССР і Японіяй. Канвэнцыя рэгулюе шэраг пытаньняў рыбалоўства японскіх падданых у саюзных ціха-акіянскіх водах.

Чычэрын і Танака абмяняліся прывітальнымі прамовамі з прычыны падпісаньня канвэнцыі.

ДЭЛЕГАЦЫІ НЯМЕЦКАГА САЮЗУ ЧЫРВОНЫХ ФРАНТАВІКОЎ ЗАБАРОНЕН УЕЗД У АЎСТРЫЮ.

ВЕНА, 23-I. Дэлегацыя бэрлінскага саюзу чырвоных франтавікоў, зьехаўшая ў Аўстрыю дзеля ўдзелу ў установчым зьезьдзе аўстрыйскага саюзу чырвоных франтавікоў, была затрымана аўстрыйскімі ўладамі на граніцы. Дэлегацыі быў забаронен уезд у Аўстрыю.

* * *

ВЕНА, 23-I. Учора вечарам пасьля дэманстрацыі чырвонага саюзу франтавікоў лідэр нямецкай кампартыі Тэльман быў затрыманы на вуліцы паліцэйскімі агэнтамі і дастаўлен у паліцэйскае ўпраўленьне. Тэльману было запрапанавана зараз-жа пакінуць Аўстрыю. Вечарам Тэльман выехаў у Нямеччыну. Да граніцы яго саправоджалі два паліцэйскіх агэнты.

НЯМОЦНАСЬЦЬ ГАБІНЭТУ ЮРАШЭЎСКАГА.

РЫГА, 21-1. Большасьцю 51 проці 43 галасоў (пры адсутнасьці 5 дэпутатаў) сойм ухваліў рэзалюцыю давер'я габінэту Юрашэўскага.

За дзень.

Развал.

Амстэрдамскі Інтэрнацыянал, які пачаў развальвацца на апошнім кангрэсе ў Парыжы, зараз заканчвае нэрыяд свайго поўнага распаду. Апошні пленум Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу гэта ленш усяго выявіў. Буйнейшая рабочая арганізацыя, якая нават зараз яшчэ ахоплівае больш 13 мільёнаў рабочых, па вачох рабочых усяго сьвету развальваецца на асобныя часткі.

Кіраўнікі ангельскіх прафсаюзаў, якія ўнутры сваёй краіны вядуць агітацыю за згоду з капіталістамі, за сьпыненьне клясавае барацьбы і за падначаленьне рэакцыйнаму закону аб прафсаюзах, на пасяджэньнях Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу разыгрываюць «левую апазіцыю».

Яшчэ на апошнім кангрэсе, як была выяўлена здрада генэральнага сэкратара Амстэрдаму гр. Удэгеста, ён, згодна пастановы кангрэсу, быў зьняты са сваёй пасады, але падшукаць яму заступніка сярод правадыроў Амстэрдаму ніяк ня можна было. Таму было ўхвалена назначыць часова выконваючым абавязкі генэральнага сэкратара немца Зассэнбаха. Але і тут перашкодзіла дыпляматыя. Французы ніяк не маглі згадзіцца, каб генэральным сэкратаром быў немец прадстаўнік пераможанай краіны, а знайсьці другую кандыдатуру ніякай магчымасьці няма. Зассэнбах зноў пакінуты часовым генэральным сэкратаром, а французы ўзялі на сябе клопаты аб тым, каб знайсьці больш удалую кандыдатуру.

Спрэчкі таксама выклікалі пытаньне адносна «сталіцы» Амстэрдаму. Ангельцы чамусьці знаходзяць, што Амстэрдам вельмі дрэнна ўплывае на Інтэрнацыянал, і таму прапануюць перанесьці яго ў Брусэль. Са свайго боку немцы знаходзяць, што куды лепей было-б перанесьці яго ў адзін з нямецкіх гарадоў. На гэтаму пытаньню згода дасягнута ня была.

Непаразуменьне паміж амстэрдамцамі таксама выклікае пытаньне адносна ўдзелу Амстэрдаму ў пасяджэньнях міжнароднага бюро працы пры Лізе Нацый. Справа ў тым, што знайшліся ініцыятары, якія прапануюць правесьці пастанову Лігі Нацый аб мінімальнай заработнай плаце для рабочых ва ўсіх краінах сьвету. Як-бы яно ні было, але міжнароднае бюро працы зьяўляецца чыста дарадчай установай, і ўсёроўна ніякага ўплыву на канчатковае вырашэньне пытаньня ня мае. Але амстэрдамцы пасьпелі па гэтаму пытаньню ўжо перадрацца.

Такім чынам, ні па воднаму пытаньню амстэрдамцы згоды не дасягнулі.

Цэнтралізацыя ўлады, альбо фашысцкая дыктатура.

Гэтымі днямі скончылася нарада нямецкага ўраду з прадстаўнікамі мясцовых урадаў. Нарада была скліканая з мэтаю дасягненьня максымальнае эканоміі на кіруючы апарат, каб больш з'эканоміць грошы і мець магчымасьць своячасова выплачваць рэпарацыі. Але пастановы нарады вышлі далёка за межы для яе вызначэньня. Нарада ўхваліла, што трэба стварыць «моцную цэнтральную дзяржаўную ўладу» і што Вэймарская канстытуцыя больш не адпавядае свайму прызначэньню і таму павінна быць перагледжана. Нарада са свайго складу вызначыла камісію, якая павінна распрацаваць праэкт для новай нарады, якая мае быць склікана.

Гэтыя размовы аб перагледзе канстытуцыі набываюць асаблівае значэньне на фоне патрабаваньняў правых элемэнтаў аб рэарганізацыі дзяржаўнае ўлады. Мы ведаем, што гэтыя патрабаваньні амаль адначасова былі высунуты ўраду партыяй нацыяналістаў, аб'яднаньнем прамысловцаў цяжкай індустрыі і банкіраў і таксама «саюзам аднаўленьня Нямеччыны», які гэтымі днямі заснаваны. Гэтыя патрабаваньні вось якія:

1) Пашырэньне ўлады прэзыдэнту за кошт парляманту. 2) Адказнасьць міністраў не перад парлямантам, а перад прэзыдэнтам. 3) Парлямант ня ўмешваецца ў фінансавыя справы. 4) Пасада рэйхс-канцлера і старшыні міністра прускага ўраду павінна выконвацца аднэй асобай. Некаторыя з гэтых праэктаў нават прапануюць на адну асобу ўскласьці абавязкі і прэзыдэнта, і рэйхс-канцлера, і старшыні прускае рады міністраў.

Ня трэба нават даказваць, што пастановы гэтае нарады цалкам супадаюць з патрабаваньнямі, якія былі высунуты фашысцкімі групамі Нямеччыны. Справа ня ў тым, каб паганіць мясцовае кіраўніцтва, а ўставаньні моцнай фашысцкай дыктатуры, якой дамагаюцца ўсе правыя элемэнты Нямеччыны.

Пэрспэктывы буржуазнага блёку нацменшасьцяў.

Віленская прэса прысьвячае шмат месца выбарным справам, а між імі справе блёку нацыянальных меншасьцяў. Як відаць з газэтных інфармацый, між паасобнымі нацыянальна-буржуазнымі групамі блёку адбываюцца частыя непаразуменьні і канфлікты, якія, магчыма, калі ня прывядуць блёк да канфлікту, дык яшчэ больш аслабяць яго.

Непаразуменьні адбываюцца на грунце надзелу мандатаў. Кожная нацыянальнасьць імкнецца адваяваць для сябе як мага больш месц. На гэтым грунце амаль не дайшло да поўнага разрыву. Віленскія ліцьвіны, якія ўступаюць сваёй колькасьцю і яўрэям і нават беларусам, рантам зажадалі для сябе першага на сьпіску месца ў Вільні. Выстаўляючы гэтае свае жаданьне, яны кіраваліся выключна палітычнымі матывамі, бо ня-жа можна, каб ў сталіце Літвы ліцьвіны не атрымалі мандату.

Такі самы канфлікт узьнік і па грунце надзелу мандатаў у Сьвянцянскай і Лідзкай акругах.

Пад уплывам такіх непаразуменьняў некаторыя палітычныя групы, якія гатовы былі прыступіць да блёку, распачынаюць новыя выбарчыя камбінацыі.

Такім чынам, блёк нацменшасьцяў, ужо ня кажучы аб яго палітычнай папулярнасьці сярод шырокіх мас, значна траціць у сваёй моцы па чыста арганізацыйных прычынах.

Наогул трэба сказаць, што буржуазнаму блёку нацменшасьцяў пры наступаючых выбарах наўрад ці ўдасьцца правесьці такі лік дэпутатаў, які яны разьлічалі. Можа нават станца так, што кандыдатуры такіх «палітыкаў», як п. п. Ярэміч, Сабалеўскі і Рагуля, калі і пройдуць у сойм, дык не галасамі беларусаў, а

Расправа з францускімі камуністамі.

Адчыненьне апошняй сэсіі францускага парламанту адбылося пры досыць незвычайных абставінах, кінуўшых чорную цень на традыцыі вольнасьці трэцяй рэспублікі.

Парлямант быў акружан узмоцненымі кардонамі паліцыі, вялікую парадную браму замкнулі на ўсе запоры і абставілі аддзеламі рэспубліканскай гвардыі. Сам пан прэфэкт быў прысутны на полі бітвы, і некалькі сот публікі прыглядалася, калі і як адбудзецца паляваньне на камуністычных дэпутатаў, якія павінны былі быць адвезены ў вастрог зараз-жа па выхадзе іх з будынку парламанту.

Дэпутат Кашэн, Куцюр'е, Дорыё, Дзюклё і Марці жартуюць над парыскай паліцыяй ужо ў працягу некалькіх месяцаў. Прысужаныя за «дзяржаўную здраду» ў сувязі з антымілітарыстычнай прапагандай у Марока, камуністычныя дэпутаты ня былі выданы палатай дэпутатаў у лістападзе мінулага году.

Урад Пуанкарэ не рабіў у той час націску на палату, бо ў урадавых сфэрах пачаліся разгалосьсі адносна інтэрпрэтацыі 14-га артыкулу канстытуцыі 1875 г. аб дэпутацкай недатычнасьці.

У часе зімовых канікул камуністычныя паслы ўкрываліся, і паліцыя не магла іх знайсьці, ад чаго яе прэстыж значна падупаў. П. Пуанкарэ грозна моршчыў бровы, і чуць ня выбух урадавы крызіс з прычыны адкупу б. правадыра «маёвага блёку» 1924 г. п. Эрыё, які не хацеў далучыцца да палітыкі моцнай рукі перад надыходзячай выбарнай кампаніяй.

ЦК францускай кампартыі прыгатаваў цяпер парыскай паліцыі няпрыемную несподзянку: выдзелегаваў на парламантарную сэсію толькі двух дэпутатаў: Кашэна і Куцюр'е, якія найспакайней аддаліся ў рукі паліцыі пасьля выхаду з пасяджэньня парламанту. Мабілізацыя ўзброеных сіл для бітвы з прыхільнікамі гвалтоўнага адабраньня камуністычных правадыроў сьведчыла аб поўнай дэзарыэнтацыі ўлады, якая ізноў высьняла сабе ў вачох любячай пазьдзекавацца францускай вуліцы.

Справа арышту пяці камуністычных дэпутатаў была прадметам прынцыповай дыскусіі ў палаце дэпутатоў. Яна была пачата па адчытаньні пісьма міністра справядлівасьці, якое «прыпамінала» палаце аб намеры ўраду арыштаваць прысужаных дэпутатаў.

Сацыялісты ўнесьлі сьпешную прапазіцыю, каб урад выказаў парламанту фармальнае жаданьне аб скасаваньні дэпутацкай недатычнасьці для камуністычных дэпутатаў. Прапазіцыя гэта апіралася на 14-ы арт. канстытуцыі 1875 г., які выразна кажа, што ніводзін член адной ці другой палаты ня можа быць прасьледаван або арыштован у часе сэсіі, хіба што з дазволу палаты, да якой належыць.

Урад адмовіўся агалосіць жаданьне аб скасаваньні недатычнасьці для камуністычных дэпутатаў, таму што большасьць палады адкінула-б скасаваньне недатычнасьці, выходзячы з палажэньня, што камуністычныя паслы не правініліся ў „дзяржаўнай здрадзе», а былі засуджаны за палітычную дзейнасьць. Карныя законы 1893 г., на аснове якіх судзілі камуністычных дэпутатаў, мелі сваёю мэтаю абвастрэньне барацьбы з анархістычнай прапагандай у слове і на пісьме.

Анархісты заўзята змагаліся тады з парламантам, як «крэпасьцю» капіталістычнай дзяржавы, і да сёньняшняга дню процістаўляюць камуністычнай тэорыі выкарыстаньне законадаўчых парламантаў у клясавай барацьбе так званую «беспасрэдную акцыю».

Сацыялістычная прапазіцыя была адкінута нязначнай большасьцю толькі таму, што група Эрыё не хацела выклікаць урадавага крызісу, які ў сучасны момант не на руку сацыяльным радыкалам.

Другая прапазіцыя, таксама абаепёртая на памянёным 14-м артыкуле, дамагалася адтажэньня арышту да канца сэсіі. Атрымала яна такую самую колькасьць 229 галасоў, якія фактычна стваряюць у францускай палаце тую лявіцу, якая ў набліжаючыхся новых выбарах уступіць у барацьбу з блёкам Пуанкарэ—Сарро—Барту.

Пуанкарэ яшчэ раз перамог, але перамога гэта толькі тактычная. Яна выклікала шмат клопатаў сярод часовых прыяцеляў, зышоўшыхся на грунце «народнай еднасьці». І таму гэтая перамога зьяўляецца хутчэй перамогай піравай.

Замежны.

Лепш і таньней

Да пастаноў XV партзьезду.

Тав. Арджанікідзэ ў дакладзе РСІ на XV зьезьдзе УсеКП, кажучы пра капітальнае будаўніцтва СССР, зазначыў шэраг сур'ёзных недахватаў будаўніцтва, заўважаных пры абсьледаваньнях РСІ, якія бясспрэчна пагаршаюць і падаражаюць працу.

Якія-ж галоўныя недахваты сучаснага будаўніцтва і як можна ад іх хутчэй пазбавіцца?

Першы і галоўны недахват, гэта—бясплянаваасьць або дрэнная плянаваасьць будаўніцтва: да гэтага часу яшчэ на мясцох праводзіцца часам праца або зусім ня ўключаная ў плян будаўніцтва, або значна перавышаючая разьмеры, прадугледжаныя плянам. Гэты бок справы часта не дацэньваецца. Плянаваасьць працы мае вялічэзнае значэньне таму, што рацыянальнае будаўніцтва магчыма наогул толькі пры правільным вучоце **перад пачаткам будаўніцтва ўсіх варункаў**, якімі вызначаецца будучая праца на пабудове заводу ці фабрыкі. Сюды адносяцца перш-на-перш—выбар раёну заводу ці фабрыкі ў залежнасьці ад адгласьці рынку збыту, наліччa сыравіны, рабочых рук і інш.; вызначэньне яго разьмераў, з забясьпечанаю збытам вытворчасьцю, і тыпу абсталяваньня; надлік кошту ўсяго заводу і складаньне калькуляцый—сабекошту будучых вырабаў, што і дае ў большасьці выпадкаў вырашэньне пытаньня аб мэтазгоднасьці ўкладу дзяржаваю сродкаў у пабудову данага заводу. Потым ужо ідзе шэраг практычных пытаньняў: выбар пэўнага месца пабудовы ў залежнасьці, ад—уласьцівасьцяў грунту, наліччa кватэр, блізкасьці шляхоў зносін, апалу, вады, энэргіі і інш., урэшце—складаньне тэхнічнага праэкту, каштарысу і калядарнага пляну правядзеньня і фінансаваньня працы, складзенага з вучотам выкананьня пабудоў і тэрмінаў паступленьня абсталяваньня.

Толькі ў тым выпадку, калі ўся гэтая складаная і цяжкая папярэдняя праца належным чынам праароблена і дапасавана з агульным плянам капітальнага будаўніцтва дзяржавы ў неабходных частках,—толькі ў гэтым выпадку,—а з гэтага складаецца плянаваасьць,—можна будаваць мэтазгодна.

Да бясплянаваасьці адносіцца-ж другі буйны недахоп, які меў месца часта на нашых першых будынках і які месцамі ня зьнішчаны і зараз, гэта—**правядзеньне працы без належнага тэхнічнага праэкту.** Без наліччa такога праэкту немагчыма і плянавая ацэнка новага заводу, таму ЦВК і абавязаў ВСНГ да ўключэньня ў плян тае ці іншае працы абавязкова мець зацьверджаны ў устаноўленым парадку тэхнічны праэкт. Пры гэтым, каб не стварацъ у цэнтры заторы праэктаў, вызначаны ўрадам па розных галінах прамысловасьці даволі буйныя ліміты (межы) кошту заводаў, праэкты якіх зацьвярджаюцца ў цэнтры. Усе-ж іншыя праэкты зацьвярджаюцца на мясцох, пад іх адказнасьцю. У кожным выпадку, наліччa правільнага складаньня праэкту—неабходна ўмова добрае працы.

Але, зразумела, вельмі мала мець добры плян будаўніцтва і нават—добры праэкт; неабходна забясьпечыць дзяржаве добрае выкананьне праэкту на справе. Рашаючае значэньне мае ўтварэньне на мясцох правільнае арганізацыі будаўніцтва, на чале з асобамі, адказнымі за ўвесь ход будаўніцтва і забясьпячэньне кожнаму будаўніцтву такіх абставін, якія давалі-б магчымасьць яму весьці працу нармальным шляхам, для чаго раней усяго патрэбна свячасовае зацьверджаньне пляну і тэхнічнага праэкту будаўніцтва і яго правільнае фінансаваньне. Пры захаваньні гэтых дзьвюх асноўных умоў кіраўнік будаўніцтва ўжо ў поўнай меры зьяўляецца адказным перад дзяржаваю за тое, каб уся праца на будаўніцтву і абсталяваньню вялася нармальным тэмпам, вызначаным у пляне, з дапасаваньнем тэрмінаў гатоўнасьці асобных частак будаўніцтва; каб усе матар'ялы і абсталяваньне дастаўляліся на будаўніцтва свячасова, каб рабочая сіла і тэхнічны апарат разгортваліся на будаўніцтве ў поўнай адпаведнасьці з магчымым у сапраўднасьці ходам працы; каб была праведзена на працы поўная рацыяналізацыя справы, з разумнаю долей мэханізацыі працы, апраўдваемай усімі абставінамі будаўніцтва, і каб пры усім гэтым былі выяўлены гаспадарчыя і эканомныя адносіны да выдаткаваньня кожнае капейкі.

Белацьвэтаў.

У Саюзных Рэспубліках.

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ПА СССР.

Жалобнае пасяджэньне ў Вялікім тэатры.

Прамова т. Калініна.

МАСКВА. 21 студзеня ў Вялікім тэатры адбыўся жалобны сход, прысьвечаны 4-й гадавіне з дню сьмерці Леніна. А 6 гадз. 50 хвіл. зьяўляюцца на сцэне і займаюць месца за сталом прэзыдыуму т. т. Калінін, Рыкаў, Молатаў, Угланаў, Сталін, Бухарын, Будзёны, Касіёр, Сьцяпанаў-Скварцоў, Гардзееў і інш.

Тав. Калінін адчыняе жалобнае пасяджэньне невялікаю ўступнаю прамовою. Сёньня—кажа ён—мінула чатыры гады з дню сьмерці Уладзіміра Ільліча. З кожным годам жывы, непасрэдна знаёмы нам Ленін адыходзіць усё далей і далей. Замест жывога Леніна ўсё прыгажэй і яскравей становіцца справа, якую тварыў Уладзімір Ільліч. За гэтыя 4 гады думкі, ідэі і зазначэньні Уладзіміра Ільліча ня толькі не забываюцца, але ўсё яшчэ больш і глыбей вывучаюцца. Пры кожным практычным кроку, які робіць наша партыя, яна знаходзіць патрэбнае ў думках Уладзіміра Ільліча, і бярэ ў іх усё новыя і новыя зазначэньні для сябе. Сёньня, у хвіліну сьмерці Уладзіміра Ільліча, ушануем яго памяць уставаньнем.

Аркестр грае жалобны марш.

У гэты момант у залі гасьне электрычнасьць і ў паўзмроку сцэны на экране стаіць у позе прамоўцы жывы Ленін. Памёр Ленін—гаворыць далей Калінін,—але ўпэўнена можна сказаць, што ніколі яшчэ жыцьцё ня было так поўна ленінізмам, як зараз. Сьвет падзелены на дзьве часткі: з аднаго боку ворагі ленінізму—буржуазея ўсіх краёў, з другога боку—усе працоўныя, якія імкнуцца да палепшаньня жыцьця, да таго, каб разарваць ланцугі капіталізму; яны захоплены ідэямі ленінізму. На чале ўсіх працоўных, бясспрэчна, ідзе зараз пралетарыят Савецкага Саюзу. Усякі посьпех ці паражэньне пралетарыяту зьяўляецца ў той-жа час посьпехам ці паражэньнем сусьветнага пралетарыяту. Гэта лепш усяго характарызуе сусьветнае значэньне Уладзіміра Ільліча. Уладзімір Ільліч быў ненасрэдным кіраўніком расейскіх працоўных масаў. У працягу 30 гадоў сталў ён на чале расейскай рэвалюцыі. Нам ніводнае хвіліны ня трэба забываць, што ён ня выпушчаў з-пад увагі інтэрнацыянальнасьці сваёй працы. Вынікі, што зрабіў і чым кіраваў Уладзімір Ільліч, маюць інтэрнацыянальнае значэньне. У гэтым асноўны сэнс нашае працы. Нашы цяжкасьці пасьля сьмерці Уладзіміра Ільліча ня зьменшыліся. Разам з ростам і разьвіцьцём матар'яльных і духоўных сіл Савецкага Саюзу ўзрастаюць і складанасьць працы і цяжкасьці. Але за чатыры гады пасьля сьмерці Уладзіміра Ільліча, наша партыя, дзякуючы правільнай лініі, здолела перамагчы шмат перашкод. Асноўны шлях, які зазначыў Уладзімір Ільліч, гэта шлях саюзу рабочае клясы з сялянствам. У сучасны момант гэты саюз расьце і мацнее. І можна быць упэўненым, што рабочая кляса ў саюзе з сялянствам пры падтрыманьні сусьветнага пралетарыяту дасягне сваёй канчатковай мэты—камунізму ва ўсім сьвеце.

Аркестр грае «Інтэрнацыянал». Тав. Калінін абвяшчае жалобнае пасяджэньне адчыненым.

З вялікім дакладам на тэму: «Ленінізм і праблема культурнае рэвалюцыі»—выступіў спатканы воплескамі Бухарын. Пасьля дакладу Бухарына з кароткім паведамленьнем аб працы Інстытуту Леніна выступіў Скварцоў-Сьцяпанаў.

Пасьля жалобнага пасяджэньня адбыўся жалобны канцэрт

ЗАДАЧЫ Ў ГАЛІНЕ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ.

Абмен думкамі на нарадзе гаспадарцаў пры НК РСІ.

МАСКВА, 21-1. У РСІ адбылася шырокая нарада працаўнікоў кантролю, прадстаўнікоў гаспадарчых арганізацый, дырэктароў трэстаў і прадпрыёмстваў, кіраўнікоў рацыяналізатарскае працы прадпрыёмстваў і фабрычна-заводзкіх грамадзкіх арганізацый. Ва ўступным слове Арджанікідзэ спыніўся на задачах РСІ ў правядзеньні рацыяналізацыі і на ўзаемадачыненьнях існуючых між адміністрацыйна-тэхнічным пэрсаналам і рацыяналізатарамі.

Нарады па рацыяналізацыі, праведзеныя прафэсарам Ярмапскім у Харкаве і Ленінградзе па заданьні НК РСІ, паказалі — сказаў Арджанікідзэ—што ўзаемадачыненьні адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу з рацыяналізатарамі не наладжаны. Між гаспадарцамі і рацыяналізатарамі няма дагаворанасьці, а іншы раз прыкмячаецца і варожасьць. Атмасфара—ня спрыяючая для шырокага правядзеньня сацыялістычнае рацыяналізацыі. Каб нашая прамысловасьць магла выканаць усе вялізныя задачы, якія стаяць перад ёю ў галіне рацыяналізацыі, зьніжэньня сабекошту і правядзеньня 7-мігадзіннага рабочага дню, неабходна знайсьці агульную мову між гаспадарцамі і рацыяналізатарамі. Патрэбна мабілізаваць для гэтае мэты ўсе навукова-тэхнічныя сілы, уцягнуць у гэтую працу шырокія рабочыя масы.

Арджанікідзэ выказвае ўпэўненасьць, што і на гэтым вучастку працы ўдасца дасягнуць значных вынікаў праз аздараўленьне атмасфэры і ўстанаўленьне правіл арганізацыйных формаў.

Потым нарада заслухала кароткі даклад кіраўніка групы абсьледавацеляў аб пастаноўцы працы і мэтадах абсьледаваньня РСІ. У спрэчках прамоўцы зазначалі, што органы РСІ не павінны самастойна праводзіць рацыяналізацыю, а толькі ставіць гэтыя пытаньні, штурхаць, будзіць ініцыятыву гаспадарцаў. Задача РСІ абмяжоўваецца выключна галінаю кантролю і арганізацыі, бо да гэтае пары няма вучоту практыкі. На думку некаторых прамоўцаў, РСІ ў ліку іншых задач павінна таксама дапамагчы зьнічыць няправільнае разуменьне некаторымі гаспадарцамі рэжыму эканоміі, бо скарачэньне адмін. выдаткаў гаспадарцы часта праводзяць за кошт скарачэньня работнікаў рацыяналізацыі. Некаторыя прамоўцы адзначалі, што ўвядзеньне тых ці іншых удасканаленьняў ня мае ўзязкі з эканамічнасьцю ўсяго прадпрыёмства. З ліку цяжкасьцяў правядзеньня рацыяналізацыі асобныя гаспадарцы адзначалі кансэрватызм у гэтым пытаньні з боку тэхнічнага пэрсаналу і рабочых. Значныя вынікі ад правядзеньня рацыяналізацыі могуць быць, калі разумна праводзіць прэміяльную сыстэму.

З прычыны вялікае зацікаўленасьці, выяўленай да пытаньняў, пастаўленых РСІ, нарада пастанавіла правесьці і далей абмеркаваньне праблемы рацыяналізацыі па наступнай нарадзе, якая адбудзецца праз некалькі дзён.

ЖАЛОБНЫЯ РАБОЧЫЯ СХОДЫ Ў ХАРКАВЕ

ХАРКАЎ, 21-I. Сёньня ў дзень гадавіны сьмерці Леніна ўсе газэты вышлі з жалобнымі артыкуламі, успамінамі і партрэтамі Леніна ў жалобных рамках. Жалобны дзень адзначан ва ўсіх гарадох Украіны. На прадпрыёмствах і заводах Кіева, Адэсы, Днепрапятроўску і іншых гарадоў у часе перапынку па абед адбыліся жалобныя сходы, прысьвечаныя памяці вялікага правадыра. З успамінамі выступалі рабочыя і чырвонаармейцы, якія блізка ведалі Леніна.

З УСІХ КАНЦОЎ.

МАСКВА, 23-I. Адусюль надыходзяць паведамленьні аб жалобных мітынгах і вечарох памяці Леніна ў адзнаку 4-х угодак яго сьмерці.

У Петразаводску УсеЛКСМ абвясьціў кампанію ўцігненьня рабочае моладзі ў саюз.

У Ніжнім-Ноўгарадзе ў дзень угодак сьмерці Леніна «ніжагародзкая камуна» правяла агляд працы прадпрыёмстваў і культурных устаноў, якія носяць імя Леніна. Падобныя-ж паведамленьні падасланы з Омску, Севастопалю і іншых гарадоў.

4-ты розыгрыш пазыкі 1927 г.

НІЖНІ - НОЎГАРАД. Учора позна ўночы ў Чырвоным Сормаве скончыўся 4-ты тыраж пазыкі 1927 г. Разыграна дзесяць выйгрышаў на 5 тысяч рублёў, пяць—па 10 тысяч, два—па 25 тысяч і адзін выйгрыш у 50 тысяч рублёў.

Выйгрышы прыпалі: па 5.000 р. на

абл.	сэрыя
3.481	4
3.820	20
9.151	7
27.581	8
34.779	16
70.621	12
105.158	19
105.274	20
131.324	8
190.290	2

па 10 тысяч рублёў

абл.	сэрыя
747	9
24.522	15
37.374	9
38.250	2
52.176	12

па 25 тысяч рублёў

164.574	7
199.179	9

50 тысяч рублёў выйграла аблігацыя 5.162, сэрыя 12.

СЬМЕРЦЬ СТАРОГА ТЭРАРЫСТА.

МАСКВА, 21-1. 21-га студзеня ў Маскве ад апэндыцыту памёр член таварыства паліткатаржан Сікорскі. Сікорскі ранейшы член партыі сацыялістаў-рэвалюцыянэраў браў удзел у забойстве міністра ўнутраных спраў Плеве, судзіўся разам з Сазонавым і быў засуджаны да 20 гадоў катаргі.

Бунт недарослых злачынцаў.

СЯМІПАЛАЦІНСК. У калёні няпоўналетніх злачынцаў здарыўся бунт. Частка выхаванцаў ўцякла. Распачата тэрміновае расьсьледаваньне. Першыя даныя гавораць аб адсутнасьці ў калёні дысцыпліны.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы.

Гомель. Акруговы зямельны аддзел разгарнуў падрыхтоўчую працу да вясеньняй сяўбы.

Засеўную плошчу акругі намечана пашырыць на два процанты.

Гэтае пашырэньне павінна быць праведзена за кошт засеўных траў, ільну, бульбы і аўсу.

Шматпольле, па пляну акрземаддзелу, будзе ўведзена на плошчы ў 34.507 дзесяцін (на 10.000 гектараў больш, чымся ў леташнім годзе). Гэтая праца не ахопіць толькі Камарынскі райён, дзе ўвядзеньне шматпольля затрымліваецца экстэнсыўнасьцю гаспадаркі.

Да гэтае пары акрземаддзел загатаваў 5000 пудоў аўса «залаты дождж» і каля 10.000 пудоў простага аўса.

Усім іншым насельнем акруга забясьпечана, за выключэньнем вікі, лубіну і льну-даўгунцу, якія будуць прывезены з-за межаў акругі.

Сельска-гаспадарчых машын і прыладаў мяркуецца адпусьціць насельніцтву ў крэдыт на суму да 50 тысяч рублёў.

Да вясеньняй засеўнай кампаніі для акругі мяркуецца закупіць 9 трактараў: 3 для савецкіх гаспадарак, 5 для калектыўных гаспадарак і 1 для пракатнага пункту па лугаводзтву.

У надыходзячую засеўную кампанію акрземаддзел мяркуе прасунуць на вёску да 15 тысяч пудоў мінэральнага ўгнаеньня (летась было кінута на вёску 9.000 пуд. угнаеньня), ня лічачы мэліарацыйных таварыстваў і калектыўных гаспадарак, для якіх асобна будзе загатоўлена 14 тысяч пудоў.

Усюды ў акрузе цяпер працуюць райённыя (кароткатэрміновыя) сельска-гаспадарчыя курсы. У Брагінскім і Ўраравідкім райёнах будуць праведзены міжрайённыя курсы па жывёлаводзтву, а ў Гомельскім райёне па садоўніцтву і гароднічству.

У лютым у Гомелі адчыняюцца паўтарамесячныя курсы па вырабу масла і сыраў.

Месцам дадзены дырэктывы аб шырокім абмеркаваньні пытаньняў вясеньняй засеўнай кампаніі.

З.

ГАСТРОЛІ БЕЛ. ВАНДРОЎНАГА ТЭАТРУ.

Калінкавічы, 21-1. Пасьля 2-хтыднёвай працы ў г. Мазыры, тэатр пераехаў у мяст. Калінкавічы і абслугоўвае зараз мястэчка і фабрыкі. Пасьля тэатр возьме напрамак на райёны.

АКРУГОВЫЯ КОНСКІЯ СПАБОРНІЦТВЫ.

Віцебск, 23-1. 28-29 студзеня на рацэ Дзьвіне адбудуцца акруговыя конскія спаборніцтвы. У спаборніцтвах прымуць удзел каля 50 сялянскіх коней. На прызы лепшым коням адпушчана 450 р.

ПАБУДОВА ТЫПАВЫХ ШКОЛ.

Старобін, 22-1. У Старобінскім райёне (Бабруйск. акр.) сёлета намечана пабудова 3 тыпавых школ. У першую чаргу школы будуць пабудованы ў в. Жабіна і Вялічкова. Насельніцтва гэтых вёсак пачало ўжо падрыхтоўку лесаматар'ялу.

ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯ ТАЛАЧЫНСКАГА КРАХМАЛЬНАГА ЗАВОДУ.

«ГЭТ» (Дзярж. электр. трэст) канчае распрацоўку праэкту па электрыфікацыі новага крахмальнага заводу, які будуецца ў м. Талочын, Аршанскай акругі. Завод абсталёван па прынцыпах новай тэхнікі. Да электрыфікацыі асьвятляючай і цягавой часткі заводу будзе прыступлена ў канцы лютага г.г.

ВЯЧЭРНІ РАБОЧЫ ПАЛІТЭХНІКУМ.

Віцебск, 23-1. 1 лютага ў Віцебску адчыняецца вячэрні рабочы палітэхнікум. Палітэхнікум будзе мець два аддзяленьні: цяпло-тэхнічнае і электрамэханічнае. Прымацца ў палітэхнікум будуць рабочыя ў веку да 35 год па камандыроўках прафсаюзаў. У першую чаргу будуць прымацца рабочыя, якія працуюць па адпаведных спэцыяльнасьцях: электра-манцёры, машыністы, качагары і г. д.

ПРАМЫСЛОВЫЯ ТАВАРЫ Ў ВЁСКУ.

Віцебск, 23-1. На час загатоўкі хлебапрадуктаў і насёньня ў акругу будзе завезена вялікая колькасьць прамысловых тавараў. На бліжэйшы час для акругі вылучана прамысловых тавараў на 30000 р.

КРЭДЫТЫ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

Бабруйск, 23-1. Акруговы сельска-гаспад. банк атрымаў за апошні час крэдыту на 126000 руб., якім будзе крэдытаваць сялянства ў другім квартале. З атрыманых крэдытаў 30000 р. пойдзе на набыцьцё рагатае жывёлы, 35000 р. па сельска-гаспадарчыя машыны, 15000 р. на малочную справу, 11000 р. на выраб агнятрывалага матар'ялу і 20000 р. на здабыцьцё корму.

ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ ПА КРЭДЫТАХ БЕЛСЕЛЬБАНКУ ПАВІННА БЫЦЬ СЫСКАНА.

Запазычанасьць за I квартал 1927-28 году дасягнула 1.500.000 руб.

Трэба сказаць, што пратэрміноўкі пазык па нізавой сетцы сел.-гас. таварыстваў за першы квартал бягучага гаспадарчага году **значна павялічыліся і дасягаюць буйнай сумы—каля 1500000 руб.** Між тым, першы квартал зьяўляецца найбольш спрыяючым для спагнаньня ўсякіх пядоімак, бо сялянства мае грошы ад узмоцненага збыту сваёй прадукцыі.

Такая вялікая запазычанасьць тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што нізавая сетка крэдытных т-ваў не аддавала належнай увагі выскаьню запазычанасьці.

Такое становішча нармальным назваць нельга, бо крэдытная дысцыпліна павінна зьяўляцца галоўнай штодзённай працай нізавой сеткі.

Белсельбанк прыняў шэраг захадаў да спагнаньня пратэрміновак па пазыках. На месцы дадзена заданьне спагнаць запазычанасьць цалкам, апрача бядняцкіх гаспадарак, якія ня маюць магчымасьці заплаціць.

Для дапамогі беднаце ня так даўно Белсельбанк разьмеркаваў па акругах 200000 р. спэцыяльна на адтэрміноваьне пазык, якія выдадзены бядняцкім гаспадаркам на вельмі кароткі тэрмін. Разам з тым у выкананьне пастановы ўраду БССР у адзнаку 10 годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі з часткі бяднейшых пазычальнікаў завінавачанасьць будзе сьпісана.

Сыскаьне пратэрміновак у першую чаргу будзе праводзіцца праз грамадзкі ўплыў шляхам абвяшчэньня на вясковых сходах сьпісаў пратэрміноўшчыкаў. Разам з тым будзе зачынен далейшы крэдыт для тых пратэрміноўшчыкаў, якія мелі магчымасьць заплаціць, але не заплацілі ў тэрмін.

Да злосных неплацельшчыкаў будуць прымацца рэпрэсыўныя меры, не застанаўліваючыся нават перад прадажай іх маемасьці.

У заключэньне неабходна сказаць, што заданьне па ўзысканьні пратэрміновак будзе выкананa цалкам, калі крэдытным т-вам прыдуць на дапамогу мясцовыя арганізацыі, установы і ўся грамадзкасьць.

II Інтэрнацыянал і пляны Пілсудзкага.

Польска-літоўскі канфлікт усё яшчэ ня страціў сваёй вострасьці. Рэзалюцыя рады Лігі Нацый ня вырашыла яго, а толькі некалькі адклала ажыцьцяўленьне плянаў Пілсудзкага наконт захвату Літвы. Даны момант зьяўляецца шмат у якіх адносінах спрыяючым для ажыцьцяўленьня гэтых плянаў. Гэтаму спрыяе і міжнароднае і ўнутранае становішча Польшчы, з аднаго боку, і міжнароднае і ўнутранае становішча Літвы—з другога.

За паўтара гады фашысцкай дыктатуры Пілсудзкага ў Польшчы дасягнута некаторая стабілізацыя капіталізму. Нядаўна Пілсудзкі атрымаў, хоць і на цяжкіх умовах, замежную (амэрыканскую) пазыку. Усе буржуазныя партыі Польшчы ў значнай меры згрупаваліся навакол Пілсудзкага. Гэта ўзмацніла яго становішча ня толькі ўнутры краю, але і ў міжнародных адносінах. Карыстаючыся гэтым, Пілсудзкі распачаў рашучае ажыцьцяўленьне сваіх заветных плянаў наконт Літвы. Захват Літвы для яго—гэта першы крок да ажыцьцяўленьня „вялікай" Польшчы. Захваціўшы яе, ён робіцца панам становішча і ў Латвіі, зьяўляецца магчымасьць яшчэ больш узмацніць свой уплыў у Эстоніі і, такім чынам, можа лёгка ўтварыцца адзіны фронт ад Балтыцкага да Чорнага мора проці СССР, пад гегемоніяй Польшчы. Усе буржуазныя і дробнабуржуазныя партыі Польшчы, ня выключаючы ППС, спачуваюць захватніцкім плянам Пілсудзкага ў адносінах да Літвы і падтрымліваюць яго ў гэтым. Унія Літвы з Польшчаю, гэта—вельмі папулярны лёзунг ня толькі сярод польскіх аграрыяў, якія імкнуцца выратаваць свае маёнткі ў Ковенскай Літве, але і сярод капіталістаў, якія імкнуцца да заваёвы літоўскіх рынкаў для польскіх тавараў і выхаду праз Літву ў мора, і нават сярод дробнай буржуазеі, асабліва сярод дробнабуржуазнай інтэлігенцыі, якая да гэтага часу марыць пра сваю «культурную» місію ў «адсталай» Літве. Ажыцьцяўленьне уніі Літвы з Польшчаю, амаль што бясспрэчна, дало-б Пілсудзкаму перамогу на надыходзячых у сакавіку выбарах у польскі сойм.

З другога боку, ангельскія і францускія імпэрыялісты, якія імкнуцца абаперціся на Польшчу ў барацьбе проці СССР, гатовы падтрымаць Пілсудзкага ў яго агрэсыўнай палітыцы проці Літвы. Яны ня хочуць больш чакаць, пакуль вырашацца польска-літоўскія спрэчкі. Яны праз увесь час дамагаюцца перад літоўскім урадам, каб ён ішоў на «дабраахвотную» згоду з Польшчаю. А з прычыны таго, што літоўскі ўрад, баючыся пратэсту шырокіх літоўскіх мас, рашуча настроеных проці саюзу і уніі сялянскай Літвы з абшарніцкай Польшчай, усё адкладае і не адважваецца канчаткова пайсьці на згоду з Польшчаю,—ангельскія і францускія імпэрыялісты і ўвесь іх друк пачынаюць нядвусэнсна падтрымліваць захватніцкія пляны Пілсудзкага. Гэта акрыліла Пілсудзкага, і ў другой палове лістапада і пачатку сьнежня ён разьвіў самую ўзмоцненую падрыхтоўку да захвату Ковенскай Літвы.

Каб замаскаваць свае ваенныя дзеяньні проці Літвы, ён высунуў т. зв. «літоўскую эміграцыю» з продажнымі літоўскімі сацыял-дэмакратамі Плячкайцісам і Паплаўскім на чале. За грошы польска-фашысцкага ўраду склікаецца імі ў Рызе зьезд літоўскіх эмігрантаў, утвараюцца спэцыяльныя атрады для арганізацыі «паўстаньняў» у Літве і г. д., бо, згодна распрацаванага Пілсудзкім пляну, літоўскі ўрад павінен быць скінуты „паўстаньнем знутры" або павінна быць з'арганізавана «вызваленьне» Літвы літоўскімі палітэмігрантамі.

Гэтых падрыхтовак Пілсудзкага нагалі «ня бачыць» толькі зацікаўленыя ў тым, каб закалыхаць увагу працоўных мас і дапамагчы ангельскім і францускім імпэрыялістам і іхняму польскаму вассалу ажыцьцявіць свае пляны.

Да гэтых «засьлепленых» належыць, у першую чаргу, уся зацікаўленая буржуазея, а за ёю цягнуцца і іх агенты ў рабочай клясе, правадыры II Інтэрнацыяналу. Праўда, спачатку ў іх ня было ніякай пагодзанасьці. Некаторыя з іх яўна наняліся на службу да Пілсудзкага (правадыры ППС, частка літоўскіх эмігрантаў). Іншыя адхілялі наліччa якіх там ня было-б захватніцкіх намераў у Пілсудзкага. Аднак факты, якія сьведчаць аб шалёнай падрыхтоўцы Пілсудзкага, былі пагэтулькі выразны, што нават некаторыя партыі II Інтэрнацыяналу прымушаны былі прызнаць наліччa непасрэднай ваеннай небясьпекі з боку Польшчы і адзначыць агідную ролю часткі літоўскіх с.-д. эмігрантаў у гэтай справе.

Так, напрыклад, калі на рыскім зьезьдзе і пасьля ў друку некаторыя літоўскія сацыял-дэмакраты і народнікі (Віконіс і Міцкус) выкрылі махінацыі польскага ўраду ў адносінах да літоўскіх палітычных эмігрантаў (сацыял-дэмакратаў і народнікаў) з мэтаю выкарыстаць іх, як фіранкі, для захвату Літвы,—орган ЦК сацыял-дэмакратычнай партыі Латвіі «Сацыял-Дэмакрат» пісаў 17-га лістапада:

«Частка літоўскіх эмігрантаў, у сваёй сьляпой нянавісьці да рэакцыйнага ўраду, гатова выкарыстаць усякую дапамогу Польшчы ў барацьбе проці ўраду свайго краю. У сваёй палітычнай сьлепаце яны не разумеюць тых небясьпечных вынікаў, якія можа мець гэтая гульня як для іх краю, так і для спакою ва ўсёй Усходняй Эўропе. Калі Польшча, сапраўды, дасьць дапамогу, дык гэта здарыцца толькі з мэтаю, каб выкарыстаць, вартым жалю парадкам, літоўскіх эмігрантаў для дасягненьня сваіх імпэрыялістычных імкненьняў, для захвату Літвы і далучэньня яе да складу Польшчы. Калі будзе распачата, усё роўна пад якою маскаю, з боку Вільні «вызваленчая вайна» проці Літвы, дык гэта, на справе, будзе толькі заваяваўчая вайна з боку Польшчы».

Венская «Арбэйтэр Цэйтунг» ад 26-га лістапада таксама пісала, што «Плячкайціс і літоўскія эмігранты ў Вільні фактычна зрабіліся зброяй польскай палітыкі пашырэньня. Яны думаюць пры дапамозе Польшчы ўвайсьці гвалтам у Літву і скінуць фашысцкі рэжым Смэтоны—Вальдэмараса»... Рыскія газэты адкрыта пішуць, што Плячкайціс з сваім паўстаньнем адыграе ролю генэрала Жэлігоўскага № 2, польскі-ж друк дае самыя доўгія справаздачы аб рыскім зьезьдзе літоўскіх эмігрантаў, і зусім не хавае, што ў сьнежні адбыцьмуць у Літве «вялікія падзеі».

Тут зусім выразна прызнаецца літоўскімі і аўстрыйскімі с-д. наліччa захватніцкіх тэндэнцый з боку Польшчы ў адносінах да Літвы і выкарыстаньне Пілсудзкім для ажыцьцяўленьня сваіх мэтаў продажных літоўскіх с-д. эмігрантаў. Аднак орган ППС «Роботнік» рашуча адхіляе гэта. Ён ня раз адзначае сваю поўную салідарнасьць з літоўскімі с-д. эмігрантамі. Прадстаўнік ППС Чыж, намесьнік віленскага гарадзкога галавы, разам з іншымі пілсудчыкамі быў у Рызе на зьезьдзе літоўскіх эмігрантаў, вітаў яго ад імя ППС і поўнасьцю салідарызаваўся з тэю часткаю зьезду, якая пашла на навадку ў Пілсудзкага (з'Плячкайцісам і інш.). Пры гэтым орган ППС ня раз піша, усьлед за афіцыйнымі органамі Пілсудзкага, што Польшча зусім ня мае намеру гвалціць Літву, што яна далёка ад якіх-небудзь ваенных дзеяньняў проці Літвы, што яна імкнецца толькі да ўціхаміраньня Усходняй Эўропы. Польшча імкнецца зьнішчыць «стан вайны», які яшчэ існуе між Літвою і Польшчаю, проці волі апошняй, яна за «нармальныя» адносіны між Літвою і Польшчаю. Наадварот, Літва ўпарта адмаўлялася ад гэтага,—значыць, яна парушала спакой на Усходзе

Загатоўкі хлеба і сыравіны ўзрастаюць.

Задаволіцца дасягнутымі посьпехамі мы ня можам.

У Мазыршчыне мясны рынак пераважна ў руках прыватніка.—У Бабруйшчыне за 3 дні загатоўлена 9000 пуд. збожжа.—Узмацнілася загатоўка экспартных тавараў.

Разам з дасягненьнямі ёсьць і вялікія недахопы.

(Лист з Мазыршчыны).

Нашая акруга не зьяўляецца хлебнай, і таму гаварыць аб тым, як праходзяць хлебазагатоўкі ня будзе характэрным для Мазыршчыны.

Наогул, Мазыршчына жыве завозным хлебам, і ў першым квартале, апрача дасылак з Белкаапсаюзу, часткова прывозіўся хлеб з Рэчыцкага, Хойніцкага і Брагінскага райёнаў Гомельскай акр. Каапэрацыя загатовак не вяла, і хлеб з гэтых райёнаў прывозіўся прыватнымі гандлярамі.

Загатоўка сыравіны.

З прычыны неўраджаю грыбоў, загатоўка іх у колькасных адносінах прайшла з меншым посьпехам, але ўсё тое, што прывозілася на рынак, закуплялася, галоўным чынам, дзяржаўнымі загатоўцамі. К прыкладу, аддзяленьне Белдзяржгандлю загатовіла 30557 кгр. сухіх і 29355 кгр. марынаваных грыбоў.

Пасьпяхова разьвівалася загатоўка смалапрадуктаў.

Трэба сказаць, што загатоўка смалы і шпігінару ў нашай акрузе праходзіла досыць пасьпяхова: загатоўлена 98.617 кгр. шпігінару і 70406 кгр. смалы.

З пушнінай і шчаціннай справа горш.

У першым квартале загатоўка шчаціны і пушніны праходзіла вельмі слаба: тлумачыцца гэтае тым, што прывоз на рынак сыравіны быў нязначны, дый наогул у гэтым годзе прымячаецца слабы выхад ваверкі. Ёсьць надея, што ў другім квартале будзе выпраўлены і гэты адсталы фронт у загатоўках.

Шукаем новых відаў экспорту.

Да новых відаў экспортнай сыравіны можна аднесьці прадукцыю Нараўлинскай фабрыкі — будуць экспартавацца яблычнае пюрэ, павідла, сушаныя яблыкі і розныя фруктовыя сокі. Узоры гэтай прадукцыі ўжо накіраваны за межы. Зьвернута таксама ўвага на экспорт рыбы: — ужо накіравана за межы 3 вагоны каралеўскага карпа, а зараз рыхтуецца адпраўка невялікімі партыямі сьвежых шчупакоў і ляшчоў. Гэты від экспорту мае быць узмоцнен.

З мясным рынкам справа ня зусім добра.

Мазыршчына ў умовах БССР зьяўляецца галоўным рынкам па загатоўцы жывёлы і мяса.

Асноўным загатоўцам на гэтым рынку зьяўляецца Белмясгандаль, але ён працуе больш выпадкова, бяз усялякага пляну. З прычыны гэтага не скарыстоўваюцца цалкам магчымасьці мясного рынку. Цікава адзначыць, што з Белмясгандлю прыяжджаюць часта прадстаўнікі з Бабруйску і Гомелю, прадпяляюць попыт ня мяса і, не атрымаўшы яго поўнасьцю, зноў выяжджаюць на 1 з палов.—2 месяцы.

Сельска-гаспадарчая каапэрацыя таксама вядзе загатоўку мяса і па дагаворах накіроўвае яго на ленінградзкі рынак. Спажывецкая каапэрацыя ў загатоўках мяса працуе куды слабей, чым с.-гаспадарчая. Наогул-жа, рынак у большасьці скарыстоўваецца прыватнікам, які накіроўвае мяса ў Ленінград.

Трэба сказаць, што ў загатоўках мяса і рознай сыравіны каапэрацыя абодвых відаў прымае вельмі малы ўдзел. Зараз Белдзяржгандаль узяўся сваімі сіламі інструктаваць нізавую каапэрацыйную сетку ў справе загатоўкі сыравіны, і будзем спадзявацца, што ўсе недахопы ў гэтай галіне будуць зьліквідаваны.

На пераломе.

(Ліст з Бабруйску).

Апошнія весткі з загатоўчага фронту гавораць аб пераломе ў руху загатовак па акрузе. Гэты пералом адбыўся дзякуючы шэрагу практычных мерапрыёмстваў, якія ўжыты адміністрацыйнымі, каапэрацыйнымі і рэгулюючымі рынак органамі ў справе пашырэньня загатовак.

Гэтыя практычныя мерапрыёмствы зводзяцца да наступнага:

Выдзелен фонд прамтавараў для накіраваньня ў хлебазагатоўчыя органы. Фонд гэты дасягае 300 тысяч рублёў. Апрача таго, пры акруговым інспэктарыяце гандлю складзен фонд прэміраваньня для загатоўчых арганізацый, якія лепей правядуць працу на загатоўках. Акруговым інспэктарыятам гандлю ўстаноўлены цьвёрдыя загатоўчыя цэны, якія ня могуць быць павышаны. Побач з гэтым усім савецкім і каапэратыўным гаспадаркам запрапанавана здаваць лішкі хлеба выключна каапэрацыйным і дзяржаўным загатоўчым органам.

Вядзецца барацьба са спэкуляцыяй. Нядаўна ў акрузе арыштавана некалькі спекулянтаў—буйных скупшчыкаў хлеба, праведзена абсьледаваньне маслабоек, у выніку чаго выяўлена кепскае санітарнае становішча прыватных маслабоек. Антысанітарнае становішча іх такое, што акркамунгандлю прышлося зачыніць 18 прыватных маслабоек.

Акрвыканком, дзеля пашырэньня хлебазагатовак, выдаў абавязковую пастанову, якая забараняе прыватнікам-уласьнікам млыноў і крупадэрак браць за перапрацоўку і апрацоўку збожжа плату натурай, дапускаючы толькі расплату грашыма.

Гэта-ж пастанова прапануе ўсім арганізацыям і арэндатарам дзяржаўных млыноў прадаваць збожжапрадукты выключна хлебазагатоўчым арганізацыям па ўстаноўленых цэнах.

Другая абавязковая пастанова акрвыканкому абавязвае прыватных асоб здаваць у засолку скуры выключна ў каапэрацыйныя і дзяржаўныя засолачныя пункты. Для кантролю над выпаўненьнем здачы скур у засолку ўведзена ў абавязак вэтнагляду патрабаваць пры кляймеиньні мяса квіток аб здачы скуры ў засолку дзяржаўным або каапэрацыйным засолачным пунктам.

Прынятыя мерапрыёмствы аказалі сваё садзейнічаньне на ход загатовак. Па вестках на 18 студзеня, за тры дні загатоўлена каля 9 тысяч пудоў збожжапрадуктаў. Асабліва пасьпяхова загатоўкі хлеба ідуць на Случчыне.

А. Д.

Хлебазагатоўкі ў Барысаве ідуць слаба

Загатоўка хлеба і сыравіны ў нашым райёне праходзіць яшчэ слаба, ня гледзячы на дырэктывы вышэйшых органаў. Прыватны гандаль займае ў загатоўках яшчэ 50 проц.

З 1 кастрычніка да апошняга часу спажывецкія таварыствы ў вёсках загатовілі: жыта 116 п. 14 ф., ячменю—11 п. 4 ф., пушніны 1822 шт.

Гарадзкія крамы да загатоўкі яшчэ толькі рыхтуюцца. У выніку гэтага прыватны гандаль у горадзе займае пераважнае месца, прычым сялянскае збожжа і сыравіна пападае ў большасьці да прыватнікаў, якія перайманоць сялян за 1-2 вярсты ад гораду і скупляюць усё, што вязуць яны на рынак.

Загатоўчым арганізацыям Барысава трэба раскачацца як найхутчэй. **Жала.**

Уся ўвага збору страхавых плацяжоў.

АКРУГІ: МАЗЫРСКАЯ, МЕНСКАЯ І АРШАНСКАЯ ІДУЦЬ НА АПОШНІМ МЕСЦЫ. АКРВЫКАНКОМЫ ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ УСЕ МЕРЫ ДА ВЫКАНАНЬНЯ ПАСТАНОЎ УРАДУ АБ УЗМАЦНЕНЬНІ ЗБОРУ СТРАХАВЫХ ПЛАЦЯЖОЎ. ДА 15 СТУДЗЕНЯ ПАСТУПІЛА СТРАХОЎКІ ЎСЯГО ТОЛЬКІ 43 ПРОЦ.

Апошнія весткі з акругаў сьведчаць, што страхавыя плацяжы паступаюць зусім слаба, ня гледзячы на прынятыя меры з боку Управы Дзяржстраху.

Ад пачатку гаспадарчага году (1-га кастрычніка) страхавыя плацяжы паступілі ў сумі 1.848.141 руб., ці 43 проц. гадавога акладу. У мінулым-жа годзе да гэтага часу паступленьне дасягала 53 проц. Зусім слабое паступленьне страхоўкі назіраецца на працягу ўсяго часу ў Мазырскай акрузе —22 проц. (у мінулым годзе—39 проц.), Менскай—40 проц. (у мін. годзе—49 проц.) і ў Аршанскай—41 проц. (у мін. годзе—46 проц.).

За апошнія два тыдні (першая палова студзеня) паступіла страхоўкі ўсяго толькі 317.090 руб., ці 7 проц. гадавога акладу. У гэтыя два тыдні асабліва адставалі — Менская (11 проц.), Аршанская (8 проц.) і Полацкая (8 проц.) акругі. У Віцебскай акрузе заўважаецца некаторае ўзмацненьне збору страхавых плацяжоў (13 проц. за два тыдні); у мінулым годзе было куды лепшае паступленьне страхоўкі.

Што датычыцца Магілёўскай, Гомельскай і Бабруйскай округ, то ў іх ніякага зруху ў паступленьні страхоўкі няма. Усяго за два тыдні гэтыя акругі сабралі 7-8 проц. налічанага гадавога акладу.

29 лютага—апошні тэрмін збору страхоўкі, а ў недаборы значыцца **2.426.000 руб., ці 57 проц. гадавога акладу.**

Калі і ўдалейшым будзе такое паступленьне, то страхавая кампанія, бязумоўна, будзе сарвана.

Акрвыканкомам неабходна зараз-жа **прыняць рашучыя меры да ўзмацненьня збору страхоўкі**, а таксама ўзмацніць нагляд, як на месцах **выконваюцца дырэктывы ўраду па гэтым пытаньні.**

Акрамя гэтага, трэба ўжыць меры прымусовага характару да неплацельшчыкаў, якія могуць плаціць. А тых, што нядбайна адносяцца да збору страхоўкі,—прыцягваць да адказнасьці.

Акрвыканкомы і райвыканкомы павінны зьвярнуць максімум увагі на збор страхоўкі з тым, каб да 29 лютага ўсё заданьне было выканана поўнасьцю.

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

Лэйзэр Крэмэр.

Кожная эпоха мае сваіх гэрояў. Кожная вялікая кампанія выдзяляе яскравых асоб. Відаць, з гэтай прычыны і хлебазагатоўчая кампанія высунула на адно з першых месц лагойскага жыхара Лэйзэра Крэмэра.

— Ну, рэб Лэйзэр,—кажа праўленьне лагойскага спажывецкага таварыства,—вось табе хусткі і паркаль, паедзеш да мужычкоў купляць тавар-сыравіну. Тры дні стой у краме, а тры дні езьдзі па вёсках.

Выслухаў Лэйзэр лагойскае спажывецкае т-ва, узяў свайго коніка і паехаў да мужычкоў.

Пачухаў Лэйзэр Крэмэр патыліцу і падумаў:

— Вось будзе добры гешэфт: мужычкам патрэбны хусткі, а мне—апосчкі, вавёрачкі, лісічкі — добрая справа!

Набраў «работнік» лагойскага спажывецкага таварыства шмат сыравіны, мяняючы яе на хусткі. Забыўшыся пра ўстаноўленыя цэны, трошкі абдурваў, трошкі не дадаваў, і прыехаў у сваю «сталіцу» Лагойск здаваць тавар.

Каму-ж здаць? Сабе самому ў астатнія тры дні, калі рэб Лэйзэр Крэмэр стаіць у краме і прымае тавар. Што значыць? Ён сам, як работнік лагойскага спажывецкага т-ва, прымае тавар у Лэйзэра Крэмэра...

Так, служачы лагойска а спажывецкага таварыства прымае ў Лэйзэра Крэмэра, г. зн. у самога сябе, тавар па сындыкаваных цэнах—ён не шкадуе сябе. Ну, а лішкі?... Тое, што ён мяняў на хусткі, тое што ён ад сялян атрымліваў тавар па цэнах ніжэй сындыкаваных?...

Каму да гэтага справа? Каго гэта цікавіць? Лэйзэр Крэмэр—гэрой: яго асоба недатыкальна. Тры дні зьбірае ў сялян тавар, а другія тры дні сам ад сябе прымае яго.

Але Крэмэр тут другарадная асоба, якая ўмее рабіць «сваю справу», дзякуючы разумным заправілам лагойскага спажывецкага т-ва.

Цікава, што скажуць пра такую «дзейнасьць» лагойскіх каапэратараў іх вышэйшыя кіраўнікі?

А. Манін.

Загатоўкі пашыраюцца.

БАРЫСАЎ, 23-1. За апошнія дзесяць дзён студзня па 17 вясковых спажывецкіх таварыствах загатоўлена 4500 пуд. жыта, 591 п. ячменю, 660 пуд. аўса, да 70 п. льнавалакна, на 1577 руб. скуранай сыравіны, на 1215 руб. шчаціны і на 965 р. журавін.

Разам з тым загатоўлена экспортнай сыравіны:—пушніны, грыбоў і чарніцы на досыць вялікую суму—25.800 руб.

ПОЛАЦАК, 23-1. За 20 дзён студзеня па 10 таварыствах спажывецкай каапэрацыі загатоўлена жыта 8091 кгр., яравых хлябоў—4586 кгр., льнянога семя—995 кгр., шчаціны—на 763 р., скуранай сыравіны—на 633 руб., мяса на 1988 р., пушніны—на 16 р., чарніцы на 259 руб.

ВІЦЕБСК, 20-I. Па 23 вясковых таварыствах спажывецкай каапэрацыі Віцебшчыны за першыя 20 дзён студзеня загатоўлена жыта—11040 кгр., яравых—54625 кгр., льнянога семя—13.713 кгр., скуранай сыравіны—на 2747 руб., пушніны—на 1042 руб., масла—на 9562 руб. і вызьвя—на 1043 п.

Пад суд за дапамогу прыватніку.

Пры дапамозе загадчыка савецкай гаспадаркі «Пагост» НА МЛЫНЕ САВХОЗУ ХАВАЛАСЯ 5000 ПУДОЎ ПШАНІЦЫ ПРЫВАТНІКАЎ, якія чакалі павялічэньня цэн, каб потым спэкульнуць. Народны Камісарыят Гандлю перадае гэтую справу ў пракуратуру для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

„Селькустыкредит" узвышае цэны.

Член праўленьня Менскага «Селькустыкредита» гр. Таўбкін, не зважаючы на ўстаноўленыя цэны па Меншчыне на жыта ў 1 руб. 40 кап., скупляў апошняе па 1 руб. 46 кап.—1 руб. 48 кап. за пуд. Хутка гэтаму «члену» прыдзецца адказаць перад савецкім судом.

НОВЫЯ ВІДЫ ЭКСПОРТУ.

Белдзяржгандаль адправіў заграніцу шмат узораў новых відаў экспорту, як крэйды, кварцавы пясок, пяньковыя вяроўкі, абсі і г. д.

ВЫВАЗ ПАТАК І ЛЕКАВЫХ РАСЬЛІН.

Беларускі харчовы трэст, па заданьні Белдзяржгандлю, адправіў першы вагон патакі ў Гамбург.

За апошні месяц Управа Белдзяржгандлю адправіла значныя партыі лекавых расьлін: кару крушынную, ліканадзіум, спарыньню і інш. Гэтыя тавары накіраваны ў Нямеччыну (у Гамбург).

ЭКСПОРТ ВАЛАКНА ЛЁНУ.

Пачынаючы са студзеня, Белдзяржгандаль распачаў экспорт ільну і нудзелі заграніцу, адначасова забясьпечваючы сыравінай мясцовую і цэнтральную прамысловасьць.

ПРЭМІЯ ЗА ДОБРУЮ І ТАННУЮ СЫРАВІНУ.

Праўленьне Белдзяржгандлю асыгнавала 3000 р. для разьмеркаваньня паміж нізавымі работнікамі пунктаў Белдзяржгандлю за загатоўку сыравіны добрай якасьці, згодна сындыкаваных цэн і выкананьне плану.

II-гі Усебеларускі зьезд яўрэяў-земляробаў

Спрэчкі па дакладу тав. Чарвякова.

На ранішнім пасяджэньні, 21-га студзеня, адбыліся спрэчкі па дакладу тав. Чарвякова, у якіх выступала звыш 20 чалав. Усе прамоўцы адзначалі дасягненьні савецкай улады за 10 год яе існаваньня і асобна спыняліся на яе посьпехах галіне нацыянальнай палітыкі.

— Ці ёсьць якая-небудзь краіна ў сьвеце,—пытае дэлегат **Ліпоўскі** з калектыва «Орта»,—дзе яўрэі-сяляне маглі-б зьбірацца і абмяркоўваць свае ўласныя інтарэсы? У той час, як у Румыніі, у Польшчы і інш. краінах ладзяць яўрэйскія пагромы, у нас, у савецкіх рэспубліках, яўрэйская нацыянальнасьць адраджаецца.

Моцны ўплыў выклікае прамова дэлегаткі **Запруцкай** з мяст. Бешанковічы. Яна дзеліцца са зьездам сваімі ўспамінамі з часоў яўрэйскага бяспраўя, з часоў існаваньня закону «аб праважыцельстве».

— Не адну ноч,—гаворыць **Запруцкая**,—я начавала на гары свайго дому, каб схавацца ад акалодачніка, які прыходзіў лавіць мяне. Не адна дзесятка рублёў папала ў лапы пристава, каб толькі ён адчапіўся і пакінуў нас на старым месцы. Кастрычнікавая рэвалюцыя ўпчэнт зьнішчыла прыгнечаньне яўрэйскай нацыі. Зараз яўрэйская нацыянальнасьць зьяўляецца роўнай з іншымі нацыянальнасьцямі.

Стары яўрэй **Прасмушкін** кажа:

— Дасягненьні савецкай улады вялізарныя. Але няхай старыя яўрэі ня думаюць, што гэта «ад бога». Не, гэта заваёвана нашай крывёй, якую мы праліваді, пачынаючы з 1905 году. 170 дэлегатаў ад 40.000 яўрэяў-сялян, якія сёньня сабраліся тут, зьяўляюцца лепшымі сьведкамі посьпехаў савецкай улады.

Тав. **Рохлін** (селянін Смалявіцкага райёну) выступіў з гарачай прамовай аб тым, як вырашаецца ў нас нацыянальнае пытаньне.

— Вось прыходжу я сюды і гавару галоўнаму чалавеку нашай краіны—тав. Чарвякоў. Гавару так і нікога не баюся. А дзе ў сьвеце можна падысьці проста да галоўнага чалавека ў дзяржаве і назваць яго «таварыш»?—Гэтага нідзе няма.

Нехай, калі яўрэй зьвяртаўся ў якую-небудзь установу, яму звычайна гаварылі: «что ты бормочешь, говори по-русски». А цяпер у нас яўрэйскія суды, яўрэйскія саветы, яўрэйская мова прызнана дзяржавай. А таму мы ўсе, як адзін, павінны ўсклікнуць: «Няхай жыве савецкая ўлада і камуністычная партыя».

— Ёсьць яўрэйская пагаворка,—кажа дэлегат **Паляшчук** (Пухавіцкага раёну):—у дні радасьці ўспамінай дні тугі. Сёньня на ўсебеларускім зьезьдзе яўрэяў-сялян успамінаю пра тыя цяжкасьці, пра тое гора, якое мы, невялічкая група яўрэяў-сялян, царцелі пры польскай акупацыі, у часы бандытызму. Гэтыя часы зусім разбурылі слабую яўрэйскую гаспадарку. А вось зараз мы сядзім разам з прадстаўнікамі нашай рэспублікі і абмяркоўваем тыя пытаньні, якія накіраваны для палепшаньня жыцьця яўрэяў-сялян, для палепшаньня дабрабыту краіны.

Наогул, усе прамовы дэлегатаў гучэлі ўдзячнасьцю на адрасу савецкай улады—першай у сьвеце улады, якая дасканала вырашыла яўрэйскае нацыянальнае пытаньне.

Справаздача беларускага „Камзету".

(даклад т. Бэй-фэста).

Савецкая ўлада паставіла сабе задачу эканамічна аздаровіць яўрэйскія бяднякія масы шляхам уцягваньня іх у прадукцыйную працу, у прыватнасьці ў сельскую гаспадарку. Найперш ўрад БССР выдаў пастанову аб земляўпарадкаваньні бедняко-яўрэяў. Адначасова з гэтым быў арганізаваны «Камзет», задачай якога зьяўляецца кіраваць земляўпарадкаваньнем яўрэяў-

Сакратар усесаюзнага «Камзету» тав. Мярэжын.

у Савецкай Беларусі. Апэрацыйнай работай у пераводзе яўрэяў на зямлю займаецца Беларускі «Озет» і яго мясцовыя органы (грамадзкая арганізацыя).

Дзеля таго, каб устанавіць дакладны лік яўрэяў, якія жадаюць перайсьці на зямлю, была праведзена спэцыяльная рэгістрацыя; яна ахапіла 201 населішча—65 проц. яўрэйскага насельніцтва БССР. Усяго было зарэгістравана 6836 сем'яў ці 34035 душ, ці 11,7 проц. усяго яўрэйскага насельніцтва. Пераважную частку складалі земляробы і саматужнікі.

За тры гады існаваньня «Камзету» яўрэйскае земляробскае насельніцтва павялічылася на 1867 сем'яў на пляцы 22081 гэкт. Усяго на 1-га кастрычніка 1927 г. налічваецца 7951 сім'я на пляцы 53940 гэкт. Калектыўных гаспадарак—169; яны займаюць пляц у 1399 гэкт.

Калектывы паказалі поўную сваю жыцьцяздольнасьць. З 169 калектываў аграмаджана прадукцыя ў 60 проц. складу ўсіх гаспадарак, амаль поўнасьцю ўсё жыцьцё ў 6 проц., а ў 24 проц. гаспадарак аграмаджана толькі зямля.

У цяжкім становішчы пакуль што знаходзяцца паасобныя землякарыстаньні з прычыны іх расьцярушанасьці і дробнасьці; у пляне „Комзету" на бягучы год адводзіцца значная месца абслугоўваньню паасобных землякарыстаньняў.

Камзет мае зараз рэальныя факты і можа пацьвердзіць, што яўрэі, якія перайшлі на зямлю, спраўляюцца з работай зусім здавальняюча. Многія гаспадаркі зараз зьяўляюцца прыкладам культурнага вядзеньня сельскай гаспадаркі.

Ёсьць, вядома, і недахопы ў яўрэйскіх гаспадарках: мала ўцягнута пакуль-што ў работу жанчына, невыстарчальна выкарыстоўваюцца ўласныя сілы на такіх работах, як загатоўка лесу і інш.

Даклад беларускага „Озета".

Аб дзейнасьці Беларускага т-ва земляўпарадкаваньня працоўных яўрэяў «Озет» зрабіў даклад т. Бунін.

Беларускі «Озет» яднае зараз 800 сяброў т-ва. На мясцох ёсьць ячэйкі «Озет». Пераважная частка сяброў т-ва—рабочыя, саматужнікі і земляробы. «Озет» зьвязан з калектывамі і арцелямі.

Прывітаньне ад Савету Нацыянальнасьцяй.

Ад імя Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК СССР выступіў з прывітаньнем т. Акімаў.

— Знаёмячыся тут, у БССР, з яўрэйскімі мястэчкамі, з яўрэйскімі сельска - гаспадарчымі калектывамі,—кажа т. Акімаў,—я пераканаўся, што яўрэйскія працоўныя масы прагнуць перайсьці на зямлю. Гэта задача вельмі паважная, і савецкая ўлада зьвяртае на яе вялікую ўвагу.

Забарона яўрэям жыць і займацца земляробствам пры царызьме не магла не адбіцца на яўрэйскім быце. З другога боку, сярод акаляючага беларускага насельніцтва яшчэ існуе сумненьне аб разьвіцьці яўрэйскага земляробства; ёсьць яшчэ людзі, якія разважаюць, што яўрэі зьяўляюцца дрэннымі земляробамі, што на яўрэйскае земляробства дзяржава траціць вялікія грошы.

З гэтымі скажэньнямі фактаў, са ўсімі цёмнымі, нягрунтоўнымі чуткамі, якія засталіся нам у спадчыну ад мінулага, трэба весьці рашучую барацьбу.

Мы маем вялікія дасягненьні ў галіне яўрэйскага земляробства, але мы заняты скромны, мы саромімся голасна гаварыць аб гэтых дасягненьнях. Я лічу, што аб гэтых дасягненьнях трэба гаварыць не саромячыся, з імі трэба знаёміць шырокія колы сялянства.

Працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй вітаюць зьезд.

У працягу апошніх двух дзён на зьезд зьявіліся з прывітаньнямі прадстаўнікі працоўных усіх нацыянальнасьцяй, якія на розных мовах віталі земляробаў; тут былі дзеці-піанэры, рабочая моладзь, чырвонаармейцы, саматужнікі, рабочыя розных заводаў, сяляне-беларусы, спэцыялісты сельскай гаспадаркі і інш.

Прамовы ўсіх выступаўшых гучэлі шчырасьцю, яны гаварылі аб тым, што яўрэі-земляробы знойдуць сабе падтрыманьне з боку ўсіх працоўных усіх нацыянальнасьцяй. Сям'я працоўных напоўнілася новымі будаўнікамі сацыялізму—яўрэйскім сялянствам, якое зойме пачэснае месца ў гэтым будаўніцтве.

Прывітаньне беларуса-селяніна тав. Капусьціна.

Таварышы, у старыя часы, калі што-небудзь здаралася, польскія і расейскія паменічыкі гаварылі, што ў гэтым вінаваты яўрэі, з другога боку, яўрэйскі капіталіст гаварыў, што ў гэтым вінен селянін. Адным словам, нас, працоўных беларусаў і яўрэяў, падбухторвалі багатыры ўсіх нацый дзеля таго, каб мы сварыліся паміж сабой, а ім, каб лягчэй было панаваць.

Зараз, пры савецкай уладзе, мы толькі зразумелі, што нас сумысьля сварылі паміж сабой.

Зараз у нас няма тых, хто падбухторваў нас адзін супроць другога. Савецкая ўлада імкнецца да таго, каб працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй жылі паміж сабой лагодна, яна імкнецца да таго, каб мы любілі адзін другога, каб мы дапамагалі адзін другому.

І мы павінны так жыць, каб любіць адзін другога, ня лічыцца з тым, што ён яўрэй, татарын ці мо' хто інш., а раз ён гарапашнік, то ён павінен мяне любіць, а я павінен яго любіць.

Няхай жыве савецкая ўлада!

Няхай жыве Ўсебеларускі зьезд яўрэяў-сялян!

Няхай жыве яўрэйскае сялянства! (Воплескі).

Сёньня зачыненьне зьезду.

Учора цэлы дзень праходзілі спрэчкі па дакладу тав. Прышчэпава. Сёньня на ранішнім пасяджэньні будзе заслухан даклад с.-г. калектыву «Ураты», Магілёўскай акр. Увечары зьезд закончыць сваю працу.

ДА ЯЎРЭЙСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ.

Краіна саветаў, якая вырашыла кардынальна ўсе заблытаныя нацыянальныя пытаньні, правільна вырашыла і пераход яўрэяў на зямлю. Камуністычная партыя паставіла задачу перад Усесаюзным Камзетам перавесьці на зямлю каля 100.000 яўрэйскіх сем'ў, разьляючы іх кампактнымі масамі. Частку яўрэйскага насельніцтва можна будзе ўпарадкаваць у БССР, у Крыме, на Ўкраіне, але гэта, аднак, не разьвязвае галоўнага пытаньня: трэба было шукаць свабодныя зямлі ў іншых месцох. Былі наладжаны экспэдыцыі ў розныя куткі Савецкага Саюзу для адшуканьня значнага абшару пад яўрэйскую калёнізацыю, на якім можна было-б пасяліць да 100.000 яўрэйскіх сем'яў.

Урэшце, былі знойдзены тыя абшары, якія адпавядаюць запатрабаваньням сельскай гаспадаркі: гэта Бірска-Байджанскі райён на Далёкім Усходзе. Гэты райён мяжуецца на поўдні—з ракой Амур, на поўначы—з чыгуначнай магістралью, на захадзе—з ракой Хін-ган.

Гэта краіна займае абшар больш, як у мільён гэктараў, г. зн. столькі, колькі займае Крымская наўвысна ці Палестына ў гістарычных межах. Ва ўсёй гэтай краіне зараз жыве каля 27.000 насельніцтва, ці адзін чалавек на адзін квадратовы кілёмэтр.

Гэта краіна абкружана са ўсіх бакоў гарамі. Дзякуючы гэтаму, клімат у гэтым райёне здаровы, і тут няма рэзкіх зьмен у атмасфэры, як гэта можна заўважыць у іншых месцох Сібіры. Тут ёсьць магчымасьць разьвінуць інтэнсыўную сельскую гаспадарку і індустрыялізацыю, бо ветры райёну хаваюць у сабе багатыя выкапні, якія да гэтага часу зусім не распрацованы. У бліжэйшыя часы ёсьць магчымасьць упягнуць у сельскую гаспадарку да 35.000 сем'яў. Усяго-ж тут можна разьмясьціць да 1.000.000 яўрэйскага насельніцтва.

Глеба райёну вельмі добрая. Кліматычныя ўмовы для сельскай гаспадаркі та самы. Тут добра расьце пшаніца, можна разводзіць рыс, ёсьць багатыя пэрспэктывы для разьвіцьця садоўніцтва (усюды расьце дзікі віноград).

Дзякуючы таму, што гэты райён знаходзіцца блізка ад чыгункі, сюды лёгка накіраваць хвалю перасяленцаў. Ужо зараз можна заўважыць, як сюды накіроўваюцца перасяленцы з розных частак Савецкага Саюзу, у тым ліку і беларусы, якія арганізуюць тут моцныя багатыя гаспадаркі.

Стаіць пытаньне толькі аб сродках. Перасяленьне і арганізацыя на месцы аднэй сям'і будзе каштаваць каля 2.000 руб. Трэба заўважыць, што да прыезду перасяленцаў земля будзе паднята, каб яму ня прыходзілася самому траціць шмат энэргіі на правядзеньне яе ў культурнае становішча. Мы спадзяёмся, што на гэту справу адгукнуцца замежныя яўрэйскія арганізацыі і пойдуць нам на дапамогу. Яны дапамогуць нам сабраць тыя грошы, якія патрэбны для перасяленьня ў гэты райён сотні тысяч яўрэйскага жыхарства, для арганізацыі тут культурнай сельскай гаспадаркі і індустрыялізацыі з магчымасьцю ў бліжэйшыя часы рэалізаваць пастанову ўсесаюзнай камуністычнай партыі аб арганізацыі тут значнай яўрэйскай аўтаномнай тэрытарыяльнай адзінкі.

* * *

21 студзеня ў Доме Культуры па пытаньні аб накіраваньні яўрэйскай калёнізацыі ў Бірска-Байджанскі райён быў наладжан мітынг. З дакладамі выступалі: сакратар усесаюзнага „Камзету" тав. Мярэжын, начальнік экспэдыцыі ў Бірска-Байджанскі райён прафэсар Брук і сакратар Беларускага „Камзет'у" тав. Бэйнфэст, якія абмалявалі перад прысутнымі становішча гэтага райёну і пэрспэктывы яго засяленьня.

Дом Культуры—былая сынагога мясцовых багатых гандляроў, у тыя часы ніколі ня бачыла такога натоўпу яўрэйскіх працоўных мас. Так пільна, так уважліва ня саўхалі тут некалі выкрутасы кантара, як зараз слухалі даклады выступаўшых таварышоў. Гэты дом, які доўгія гады толькі чуў лянівае мармытаньне моляў сытых буржуяў, у гэты вечар пачуў сьмелае, бадзёрае слова яўрэйскага гарапашніка—зьезду яўрэяў-сялян:

— Мы блізьмежна верым камуністычнай партыі, мы сьмела пойдзем туды, дзе можна працаваць. Нас не запалохаюць шэпты і пяткі гандляроў і іх кампаніі.

Мы пойдзем у далёкую Бірска-Байджанскую краіну будаваць сацыялізм!

Пазыка узмацненьня сялянскае гаспадаркі.

Роля камсамолу ў разьмеркаваньні пазыкі.

Пазыка ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі мае вялікае значэньне для кожнага селяніна. Селянін непасрэдна адчувае, як душыць яго зношанасьць і недахват машын, брак жывёлы, недахоп добрага насеньня. А таму можна з упэўненасьцю сказаць, што пазыка ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі спаткае жывы водгук на вёсцы, і што посьпех яе забясьпечаны.

Асабліва жыва павінна адгукнуцца на пазыку сялянская моладзь. Пажылы селянін прызвычаіўся ўжо да недахопаў сваёй гаспадаркі. Ён у гэтых абставінах вырас, у яго няма таго актыўнага парыву да жыцьця, які масцца ў моладзі. Моладзь ня можа пагадзіцца з працаю на старых плугах, па трохпольнай сыстэме; яна разумее неабходнасьць рашучага перавароту ў сельскай гаспадарцы. А гэты пераварот магчымы толькі пры атрыманьні дадатковых сродкаў, якія павінны быць сабраны шляхам разьмеркаваньня пазыкі.

Вясковая моладзь адчувае патрэбу ў культурна-асьветных установах. Гарачы парыў моладзі да вучэньня спатыкае няхват сродкаў дзеля здаволеньня растучых запытаў мас. Тое, што дзесятая частка пазыкі будзе выдадзена на культурна-гаспадарчыя патрэбы райёнаў, павінна моцна зацікавіць моладзь. Ад самой моладзі будзе залежаць паскораньне разьвіцьця культурнае працы ў райёне.

Звычайным зьяўляецца цяпер актыўнае выступленьне моладзі ў справе ўвядзеньня новых мэтадаў сельскае гаспадаркі (разьвядзеньне кораньплодаў, палепшаньне гатунку жывёлы і інш.). Гэтая работа моладзі магла-б разгарнуцца шырэй, калі-б моладзь мела больш тэхнічных сродкаў (машын, насеньня і г. д.).

На дапамогу моладзі ў гэтай справе прыходзіць пазыка.

Пры вялікай колькасьці выйгрышаў (332.640) відавочна, што на кожную вёску прыпадуць выйгрышы, якія можна будзе атрымаць, калі хто захоча, не грашыма, а сельска-гаспадарчымі машынамі.

Удзел у гэтай сазыцы зусім даступны для моладзі; аблігацыя каштуе ўсяго 10 руб., а чвэртка 2 р. 50 кап.

Усёй вясковай моладзі, раней усяго, камсамольцам, належыць неадкладна распачаць падрыхтоўку распаўсюджаньня пазыкі.

Дзеля гэтага павінны быць выкарыстаны ўсе сродкі масавае агітацыі: даклады на вясковых сходах, пастаноўка агітп'ес, гутаркі з сялянамі, выдача справак аб пазыцы, зьмяшчэньне вестак аб пазыцы ў насьценных газэтах,—усё гэта павінна быць ужыта. Да пачатку рэалізацыі кожны селянін павінен ведаць умовы пазыкі, і пад гэтым лёзунгам неабходна весьці работу.

Адказная роля належыць камсамолу і ў справе продажы аблігацый. Тут актыўнасьць моладзі і яе здольнасьць ісьці наперадзе асноўнае масы сялянства—павінны прынесьці вялікую карысьць.

А. Львоў.

МАКСІМУМ УВАГІ З БОКУ КААПЭРАЦЫІ ДА РАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ ПАЗЫКІ.

Цэнтральны Беларускі Каапэрацыйны Савет зьвярнуўся да ўсіх каапэрацыйных арганізацый БССР з адозвай, у якой заклікае гэтыя арганізацыі да самага шырокага ўдзелу ў кампаніі рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

Практычна работа каапэрацыйных арганізацый у распаўсюджаньні аблігацый пазыкі павінна вывіцца ў наступным:

Каапэрацыя павінна найшырэй удзельнічаць у агульнай аблігацыйнай працы па разьмеркаваньні пазыкі, якую праводзяць на мясцох спэцыяльна ўтвораныя акруговыя і райённыя камісіі.

Весьці непасрэдную працу па разьмеркаваньні аблігацый праз каапэрацыйныя арганізацыі ў райёне сваёй дзейнасьці на наступных асновах:

Рэалізацыя пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі праводзіцца да 30 сакавіка г. г. уключна.

Продаж аблігацый адбываецца з адначасовай аплатай іх кошту. Да атрыманьня аблігацый рэалізацыя пазыкі праводзіцца па часовых квітанцыях.

Арганізацыі ўсіх відаў каапэрацыі сельскіх мясцовасьцяў павінны ўзяць на сябе рэалізацыю пазыкі, дагаварыўшыся аб гэтым з райвыканкомамі.

УСІМ ПРАФОРГАНАМ І ЎСІМ СЯБРАМ САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

ПАВАЖАНЫЯ ТАВ

У прэзыдыуме ЦВК БССР.

ТАВ. ХАЦКЕВІЧ ВЯРНУЎСЯ З МАСКВЫ.

Сэкратар ЦВК БССР тав. А. Хацкевіч вярнуўся з Масквы, куды ён езьдзіў для ўдзелу ў пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР.

Тав. Хацкевіч, вярнуўшыся з Масквы, уручыў Ордэн „Чырвоны Штандар" Начальніку Мініны і Крымінальнага Вышуку Рэспублікі тав. Кролю Яфіму Майсеевічу.

КАМІСІЯ САДЗЕЙНІЧАНЬНЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ.

Згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР ад 19 студзеня 1928 году, арганізавана Центральная Камісія садзейнічаньня рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі ў складзе: т. Хацкевіч (Старшыня Камісіі), т.т. Гарбуз, Абрамсон, Раманчук, Каплан, Наўлянскі, Вайтонкаў, Аксючыц, Адзінцоў, Тафеенка, Шукевіч-Трэньнікоў, Доўгаланьцева, Дубіна, Прышчэпаў, Яцкевіч.

На Камісію ўскладзена актыўнае кіраўніцтва ўсім ходам кампаніі на рэалізацыі пазыкі ў Г.

Галоўныя задачы студэнцтва ў вёсцы.

Зараз у вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах БССР адбываюцца зімовыя вакацыі. Студэнцтва пасьля першай паловы навучальнага году накіравалася дамоў на месячны перапынак у занятках. З вялікага адзінага калектыву пралетарскага студэнцтва некалькі тысяч чалавек накіраваліся ў розныя вёскі і мястэчкі. У розных куткох Беларусі, амаль у кожным раёне, сельсавеце зараз магчыма спаткаць студэнта тэй ці іншай беларускай ВНУ або тэхнікуму.

У гэтым годзе, як ужо паведамлялася, студэнцкія арганізацыі не давалі студэнцтву ніякіх канкрэтных заданьняў грамадзкай працы, як гэта было ў мінулыя гады, калі кожны атрымліваў 4-5 даручэньняў, у выніку чаго студэнт распыляўся і ня мог нават адпачыць. Студэнцкія арганізацыі лічаць, што **зімовыя вакацыі—гэта законны месячны адпачынак**, які павінен даць магчымасьць студэнту ўзмацніць свае сілы, падрыхтавацца да далейшай акадэмічнай упартай і напружанай працы ў цяжкіх умовах у другім паўгодзьдзі, каб з гонарам працягнуць акадэмічны год, належным чынам яго выкарыстаць у набыцьці ведаў, неабходных кожнаму будучаму спэцыялісту.

Зімовыя вакацыі выключна для адпачынку, але **разумнага** адпачынку, г. зн., што студэнт, прыехаўшы дамоў, не павінен увесь месяц толькі есьці, спаць і гуляць. Гэта было-б няправільна. Гэткі «адпачынак» не патрэбен пралетарскаму студэнцтву. Лепшым адпачынкам ад разумовай акадэмічнай працы пад кнігай зьяўляецца практычная праца.

Ці адзін пралетарскі студэнт, прыехаўшы ў вёску ці мястэчка, ня можа ізаляваць сябе ад грамадзкага жыцьця гэтай мясцовасьці, ад рабоча-сялянскіх мас: пралетарскі, рэвалюцыйны абавязак кожнага чырвонага студэнта прыняць удзел у гэтым жыцьці, адначасова рацыянальна разьмяркоўваючы кожны дзень вакацый, каб належным чынам адпачыць.

Студэнт павінен, калі яго запытаюць, дакладна і зразумела растлумачыць сялянству аб міжнародным і ўнутраным становішчы нашай краіны, аб капіталістычным акружэньні, аб посьпехах і цяжкасьцях у сацыялістычным будаўніцтве, аб неабходнасьці большай актыўнасьці ў працы саветаў, каапэрацыі, барацьбе з бюракратызмам.

У прыватнасьці, зараз праводзіцца шэраг кампаній, мастчых вялікае значэньне,—іх не павінен абыйсьці студэнт.

Зараз шырока разгорнута праца ў вёсцы па хлебазагатоўках. Задача кожнага сьвядомага студэнта дапамагчы мясцовым органам у гэтай важнай і адказнай працы; студэнт павінен быць агітатарам сярод сялянства, каб яны дапамаглі 100 проц. выкананьню пляну загатовак.

У лютым працоўныя будуць сьвяткаваць 10-цігодзьдзе Рабоча-Сялянскай Гэраічнай Чырвонай арміі. Зараз на ўсім абшары Савецкага Саюзу пачалася падрыхтоўчая праца да гэтага вялікага сьвята. Прыняць удзел у падрыхтоўчай працы, папулярызаваць Осо-Авіяхім, дапамагчы яму ў працы па ваенізацыі насельніцтва, наладзіць агляд працы па шэфству і ўзмацненьні абароназдольнасьці нашае краіны,—вось што павінен зрабіць кожны студэнт, зразумела, супольна з мясцовымі працаўнікамі і арганізацыямі.

Гэтымі днямі ўрад выдаў закон аб самаабкладаньні насельніцтва. Шырока папулярызаваць яго, растлумачыць, што самаабкладаньне дапаможа вёсцы больш шпарка разьвіць мясцовае будаўніцтва, што сродкі ад самаабкладаньня пойдуць выключна на патрэбы свайго раёну ў гаспадарчых, культурна-асьветных і санітарных адносінах, наогул, на паленшаньне свайго дабрабыту, расказаць сялянству, чым выкліканы гэты закон—трэба пралетарскаму студэнту.

Нарэшце, зараз праходзіць распаўсюджаньне новай пазыкі—пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі. Гэтая пазыка мае вялікае значэньне, і студэнту неабходна аб гэтым расказаць сялянству і прыняць актыўны ўдзел у яе распаўсюджаньні, каб ахапіць пазыкай мажліва больш лік сялян і сваячасова яе разьмеркаваць.

Гэтую працу цалкам можна зрабіць з добрым выкарыстаньнем вакацый для адпачынку.

Разумны адпачынак разам з дёзунгам—«бліжэй да масы» і ўдзелам у грамадзкім жыцьці—вось задачы студэнцтва ў часе зімовых вакацый. Львовіч.

Краязнаўчая праца на мясцох.

Краязнаўчая праца ў Полацкай акрузе.

Да восені 1925 г. краязнаўчая справа ў Полацкай акрузе амаль што не існавала. Пасьля арганізацыі акруговага т-ва шпарка пачынаюць узьнікаць райённыя т-вы і краязнаўчыя гурткі. Культурна-гістарычная сэкцыя акруговага т-ва ўзяла на вучот усе гістарычныя помнікі старасьветчыны, уклала карту археолёгічных помнікаў, зьбіраецца розны матар'ял на гісторыі рэвалюцыйнага руху на Беларусі, вядзецца праца на ўкладаньні геаграфічнага слоўніка, былі наладжаны экскурсіі ў цікавыя мясьціны акругі і г. д.

Акруговы краязнаўчы музэй у апошні час значна ўзбагаціўся этнаграфічнымі, экспанатамі і інш. экспанатамі.

Як працуе Клічаўскае краязнаўчае т-ва.

У склад Клічаўскага райённага краязнаўчага т-ва зараз уваходзіць 137 сяброў. Т-ва яднае 6 гурткоў па 6-ці сельсаветах і 1 школьны гурток. Аснаўной працай т-ва зьяўляецца: зьбіраньне географічных навываў, дасьледаваньне сельскіх промыслаў і хатніх рамёстваў, вывучэньне прыродных фарбаў, дасьледаваньне санітарна-культурнага стану вёскі і вывучэньне асаблівасьцяй беларускай мовы Клічаўскага райёну.

Да гэтага часу т-ва ўклала карту лясных прасторaў Клічаўскага лясьніцтва, выгадавала 30 каранёў морвы (шаўкоўніцы), за што т-ва атрымала дыплём, сабрана калекцыя казавак, некаторых відаў вадаземнікаў і інш.

Захады да палепшаньня стану менскага вадаправоду.

Будаўніча-транспартная сэкцыя Дзяржпляну гэтымі днямі заслухала даклад аб становішчы менскага вадаправоду. З дакладу відаць, што яно катастрафічнае, і неабходна прымаць усе меры, каб палепшыць падачу вады.

Якасьць вады і тэхнічнае становішча брукліскіх студняў час ад часу пагаршаюцца. Якасьць вады ў студні № 4 па сваім хімічным складзе зусім нягодная для піцьця.

Вадаправодныя трубы ўсяе магістралі і сеткі вельмі забруджаны. Гэта пагражае закуркаю ў бліжэйшы час значнага процанту вадаправодных труб.

Памянёныя прычыны выклікаюць неабходнасьць як найхутчэй прыняцца за палепшаньне становішча вадаправоду, наладзіць і забясьпечыць дастаўку вады.

У першую чаргу неабходна правесьці досьледы крыніц, з якіх павінна быць арганізована дастаўка вады. Гэтыя работы будуць каштаваць каля 250.000 руб. і працягнуцца каля 2 год.

Толькі пасьля гэтых работ можна прыступіць да складаньня праекту па перабудаваньні і пашырэньні вадаправоднай сеткі г. Менску.

Такім чынам, праца па перабудаваньні і пашырэньні вадаправоду можа быць закончана праз 4-6 год і будзе каштаваць, па прыблізных падліках, каля 3 міліёнаў руб.

Менскі акрыканком у бліжэйшы час мяркуе прыступіць да досьледу крыніц дастаўкі вады, дзеля чаго будуць закладзены тры пробныя артэзіянскія шчыліны, прычым адна з іх у першую чаргу, а дзьве другія — пасьля належнага вывучэньня першай.

З заграніцы мяркуецца выпісаць належнае абсталяваньне і помпы.

Трэба як найхутчэй і рашучаўзяцца за гэту справу, бо пытаньне аб вадзе зьяўляецца самым сур'ёзным і актуальным пытаньнем для гораду.

Хроніка.

У Беларускім Дасьледчым Інстытуце імя Леніна.

ГАДАВІНА ЗАСНАВАНЬНЯ ІНСТЫТУТУ.

Ў чацьвер, 26-га студзеня, у канфэрэнцзалі ІБК адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае гадавіне заснаваньня Беларускага Дасьледчага Інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна. З дакладамі выступяць: т. т. Прышчэпаў, Гарэцкі, праф. Дубах і праф. Мельнік.

Да гадавіны свайго існаваньня інстытут выпускае зборнік „Год працы інстытуту" і чарговы нумар часопісу „Сельская і лясная гаспадарка", прысьвечаны гэтаму юбілею.

ПРЫЕЗД НАВУКОВАГА ПРАЦАЎНІКА Т. БАХМЕЕВА.

У Менск прыехаў для працы ў Інстытуце ў якасьці кансультанта па торфараспрацоўках і культуры балот т. Бахмееў, навуковы супрацоўнік Акадэміі Навук СССР, былы загадчык ноўгарадзкай дасьледчай балотнай станцыі і арганізатар тарфянога ін-ту Наркамзему РСФСР. Т. Бахмееў будзе адначасова кіраваць культур-тэхнічным аддзелам Наркамзему БССР.

ВЫВУЧЭНЬНЕ АГРАРНЫХ АДНОСІН ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

У сувязі з тым, што міжнародны аграрны інстытут у Маскве рыхтуе да друку зборнік «Аграрныя адносіны Заходняй Беларусі", у Менск прыяжджаў прадстаўнік міжнароднага ін-ту т. Чорнабаеў для наладжаньня сувязі з дасьледчым ін-там і ІБК у справе вывучэньня гэтага пытаньня.

Беларуская дасьледчая інстытуцыі далі вычарпальна даведкі для гэтага зборніку.

ІНСТЫТУТ СЯЛЯН-ДАСЬЛЕДЧЫКАЎ.

Спэцыяльнае бюро Беларускага Дасьледчага Інстытуту, якое кіруе работай арганізацыі сялян-дасьледчыкаў, аб'яднае 530 сялян-адзіночак, 14 саўгаспадарак, 14 с-г. калектываў, 14 розных школ, 8 мэліяратыўных т-ваў і 5 с.-г. гурткоў.

Сёлета былі праведзены 263 вопыты пад розным угнаеньнем пад жыта, авёс, бульбу і культурай балот. У далейшым будуць праводзіцца вопыты ў галіне жывёлаводзтва, садоўніцтва і гародніцтва.

Сялянe-дасьледчыкі атрымліваюць дармова штучнае ўгнаеньне і сортавае насеньне, а мясцовыя дасьледчыя станцыі і агрэномы дамагаюць ім розными парадамі.

Беларускі дасьледчы інстытут узьняў пытаньне перад наркамфінам аб вызваленьні ад ападаткаваньня вопытных вучастка ў гаспадарках сялян-дасьледчыкаў.

Вясной гэтага году адбудуцца канфэрэнцыі сялян-дасьледчыкаў на дасьледчых станцыях, вакол якіх вопытнікі групуюцца.

У прэзыдыуме Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР.

5.000 руб. на дапамогу дзецям Заходняй Беларусі.

Прымаючы пад увагу вельмі цяжкае матар'яльнае становішча бяспрытульных дзяцей у Заходняй Беларусі, Центральная Дзіцячая Камісія пры ЦВК БССР пастанавіла адпусьціць 5.000 руб.

Апроч гэтага, акруговым дзіцячым камісіям і т-вам „Прыхільнік Дзіцей" заграпавана таксама прадугледзіць у сваіх кашторысах поўныя сумы на гэтую справу.

4.000 руб. на адчыненьне ясьляў.

Центральная Дзіцячая Камісія пры ЦВК БССР пастанавіла дадаткова адпусьціць на адчыненьне ўлетку ясьляў 2.000 руб. Усяго, такім чынам, у бягучым 1927-28 апрацыйным годзе на лініі Центральнай Дзіцячай Камісіі на адчыненьне летніх дзіцячых ясьляў будзе адпушчана 4000 руб.

Месячнік дапамогі бяспрытульным дзецям.

Центральная Дзіцячая Камісія узгадніла з адпаведнымі ведамствамі і ўстановамі пытаньне аб правядзеньні на БССР месячніка дапамогі бяспрытульным дзецям. Зараз гэта пытаньне перададзена на канчатковае зацьверджаньне ў прэзыдыум ЦВК БССР.

Месячнік мае быць праведзен з 1-га сакавіка г. г.

Дзіцячыя пляцоўкі для дзяцей батрачак.

Улічваючы важнае значэньне, якое адыгрываюць дзіцячыя пляцоўкі ў вёсцы у летні час, Центральная Дзіцячая Камісія пры ЦВК БССР пастанавіла арганізаваць гэткія пляцоўкі для дзяцей батрачак у вёсцы. На гэту патрэбу пастаноўлена адпусьціць 4.000 руб.

Гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчак.

Дзяржаўная Плянавая Камісія склала праэкт пастановы СНК БССР аб гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак Беларусі. Згодна гэтага праэкту, у першую чаргу маюць быць упарадкаваны наступныя мястэчкі:

Бешанковічы (Віцебшчына), Уваравічы (Гомельшчына), Сьмілавічы (Меншчына), Капаткевічы (Мазыршчына), Красноволье (Магілёўшчына), Чарэя (Аршаншчына) і Асьвея (Полаччына).

Побач з гэтым, у праэкце адзначана неабходнасьць скласьці 5-гадовы плян упарадкаваньня рэшты мястэчак Беларусі.

Да 1-га кастрычніка 1928 году мае быць складзен генэральны плян гаспадарчага ўпарадкаваньня мястэчак БССР.

АД'ЕЗД ТАВ. ГАЛАДЗЕДА Ў МАСКВУ.

Учора тав. Галадзед паехаў у Маскву для ўдзелу ў пасяджэньнях СНК СССР па разгляду дзяржаўнага бюджэту.

Справаздача беларускай дэлегацыі 1-га ўсесаюзнага падалёгічнага зьезду.

Беларуская дэлегацыя 1-га ўсесаюзнага падалёгічнага зьезду прачытае шэраг справаздачных дакладаў аб працах зьезду.

Першыя даклады адбудуцца ў чацьвер, 26-га студзеня г.г. а 8-й гадзіне вечара ў Пэдгабінэце пры Доме Асьветы па наступнай навестцы:

„Першы ўсесаюзны падалёгічны зьезд і яго значэньне ў падалёгіі і педагогіцы"—дакл. т. Рывес.

„Спрачныя пытаньні падалёгічнай мэтадалёгіі на 1-м падалёгічным зьезьдзе"—дакл. праф. Васілейскі.

Запрашаюцца падалёгі, педагогі і ўрачы.

Лекцыі аб санітарыі для працоўных.

За апошнія 3 месяцы Домам Санітарнай Асьветы наладжана 117 лекцый і гутарак з лікам слухачоў у 7.503 чал. Гэтыя лекцыі ў большасьці чыталіся на фабрыках, заводах і ўстановах Менску.

Рэалізацыя прадукцыі фабрык «Лесбелу» на рынках СССР

Маскоўская кантора Белпайгандлю прыступіла да рэалізацыі на пазабеларускіх рынках мэблі фабрык „Лесбелу".

Зараз кантора мае для продажу 10.000 штук крэслаў і 1.000 штук драўляных ложкаў.

Жылбудаўніцтва ў БССР.

У мінулым 1926-27 годзе на жылбудаўніцтва ў БССР было расходавана каля 10 мілёнаў руб. Акрамя таго, на капітальны рамонты расходавана каля 4 мілёнаў рублёў.

У 1927-28 годзе на новае жылбудаўніцтва мае быць адпушчана да 12 мілёнаў руб.

Будзе пабудавана каля 140 тысяч кв. мэтраў жыллюшчы.

У працягу 5-хгодзьдзя на новае жылбудаўніцтва мае быць адпушчана каля 89.000.000 рублёў.

10 вагонаў баваўнянай тканіны для БССР

Устаноўлен плян завозу баваўнянай тканіны на другую дэкаду студзеня г. г. Згодна гэтага пляну, у БССР мае быць завезена 10 вагонаў баваўнянай тканіны.

Падрыхтоўка да 2-га ўсебеларускага зьезду Мопр'у.

2-гі ўсебеларускі зьезд Мопр'у адчыняецца 28-га студзеня. У працах зьезду прымуць удзел каля 100 дэлегатаў са ўсіх акругаў БССР. Зьезд будзе працаваць у Центральным Доме Асьветы. Зьезд заслухае даклад аб міжнародным і ўнутраным становішчы, даклады Выканкому Мопр'у і ЦК Мопр'у СССР. Апроч гэтага, будзе заслухана справаздача ЦК Мопр'у БССР і рэвізійнай камісіі, выбары кіруючых органаў і дэлегатаў на ўсесаюзны зьезд Мопр'у, які адбудзенна 18 сакавіка г.г.

Запрашэньні на зьезд.

Прэзыдыум ЦК Мопр'у БССР на сьлім апошнім пасяджэньні пастанавіў запрасіць для ўдзелу ў працах 2-га ўсебеларускага зьезду Мопр'у прадстаўнікоў ад усеукраінскага ЦК Мопр'у і ад палітупраўленьня Беларускай Вайсковай Акругі. На зьезд таксама мае прыехаць для дакладу аб дзейнасьці Выканкому Мопр'у і ЦК Мопр'у СССР намесьнік Выканкому Мопру, і старшыня ЦК Мопр'у СССР тав. Стасава.

Выстаўка Мопр'у.

ЦК Мопр'у БССР наладжвае да часу 2-га ўсебеларускага зьезду Мопр'у выстаўку. Гэта выстаўка мае высьветліць становішча і працу арганізацыі Мопр'у на мясцох, жыцьцё і становішча палітвязьняў і г. д. Выстаўка будзе адчынена на ўвесь час зьезду.

289.223 руб. у карысьць палітвязьняў буржуазных вастрогаў.

ЦК Мопр'у БССР падлічыў колькасьць сродкаў, сабраных за час з 1-га мая 1925 году па 31-га сьнежня 1927 году ў карысьць палітвязьняў буржуазных вастрогаў. За гэты час у ЦК Мопр'у БССР паступіла 289.223 руб., у гэтым ліку ад сяброўскіх узносаў—120.358 руб., ад кампаніяў дапамогі палітвязьням Заходняй Беларусі—75.397 руб. і ад мопраўскай літаратуры—41.602 руб.

СУД.

Працэс 16 бандытаў.

З 20-га лютага г. г. у Менскім акруговым судзе, пад старшынствам Жылінскага, з удзелам пракурора і абароны, будзе слухацца справа вядомай бандыцкай шайкі, праводзром якой быў Паўла Паўлючэнка, а находнікам яго—Навас Прахарчук.

Акалічнасьці справы наступныя:

У сэой час Паўла Паўлючэнка працаваў у Чэрвенскім вялыкакомсе справаводам вайсковага стала. Зьнюхаўшыся з дэзэртырамі і кулакамі, ён падрабляў конскія пучотныя картві, выдаваў дэзэртырам падложныя дакументы, і наогул, шмат чаго нарабіў злачынага, за што і быў разам з Прахарчуком засуджан і трымаўся ў папраўчым доме. Будучы пасланымі на работу ў калёвіцу, Прахарчук і Паўлючэнка згаварыліся і ўцякаі з калёніі ў лес.

У хуткім часе да Паўлючэнкі і Прахарчука, якія заселі ў сьцілавіцкіх і чэрвенскіх лясох, далучыліся: Крук Лявон, Жданок, Крывіцкі, Шатэрнік, Знак і іншыя бандыты; яны здабылі зброю і пачалі сваю злачынную дзьвяласьць.

Страшна было праходзіць і праяжджаць у той час на дарогах Сьмілаўскага і Чэрвенскага раёнаў. Банда тэрарызавала насельніцтва. Ня толькі ночу, але і сярод белага дня бандыты зьяўляліся ў вёсках, рабавалі, выдзекваліся, білі і катавалі. Пра многія рабункі сяляне нават не заўлялі міліцыі, баючыся бандытаў.

— Маўчы, Сымон, калі хочаш жыць, а то як пачуе Паўлючэнка і зьвяжца з сваім войскам, дык мала таго, што заб'е, а яшчэ спаліць гаспадарку і ўсё зьвяжыць ўпчэт.

Вось якую пагрозу распаўсюджваў главар банды Паўлючэнка. Сялянам ён заяўляў, што дзейнічае ад імя польскага генэральнага штабу.

Галоўныя напады гэтай банды наступныя:

Абрабаваньне гр. Пятровіча, дзе бандыты перавязалі ўсю сям'ю, забралі адзеньне, золата і інш. рэчы.

Абрабаваньне гр. Паўла Тумеля, якога бандыты не толькі абрабавалі, але, разьдзеўшы да тла, калолі нажом у сьпіну.

Банда зрабіла яшчэ адны шэраг ограбленьняў сялян, а таксама абрабавала грасьбскую царкву.

Ва ўсіх рабунках і нападах бандыты на папярэднім следзтве прызналіся.

На справе выклікаецца каля 10 пацярпеўшых і 30 сьведкаў.

Разгляд справы працягнецца некалькі дзён. Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

За крадзеж з каапэрацыйнай крамы.

Грамадз. вёскі Чарнава, Чэрвенскага раёну, Нічыпар Зыль у ноч на 3 верасьня 1926 году праз узлом вакна ў краме Чаркаўскага спажывецкага таварыства ўкраў 34 руб.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Нічыпара Зыля на тры гады зьвяволеньня, але, прымаючы пад увагу пазначаньне вынікаў ад злачынства, скараціў кару да 6 месяцаў і па амністыі ад зьвяволеньня аслабаніў.

«Пад мухай».

Грамада. г. Менску Алесь Янушкевіч 16-га красавіка 1927 году, будучы ў п'яным становішчы, разьбіў вакно ў кватэры грам. Матусевіч. Калі на крык апошняй прыйшоў паставы міліцыянэр і хацеў затрымаць Янушкевіча, апошні аказаў міліцыянэру супраціўленьне, прычым абляяў яго.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Алеся Янушкевіча на 6 месяцаў зьвяволеньня, але на аснове амністыі ад пакаравьня вызваліў.

Чучала зубра ў беларускім музэі.

На пашыраным пасяджэньні рады Інбелкульта прафэсар Фядзюшын паведаміў аб дазволе ад Акадэміі Навук СССР атрымаць чучала зубра для зоолёгічнага музэю Беларусі.

Чучала належала Мікалаю II і да сучаснага моманту разам з іншымі такімі-ж экземплярамі знаходзілася ў б. Зімнім Палацы ў Ленінградзе. Яно зьяўляецца адным з лепшых па выкананьні са ўсіх, якія ёсьць у музэях СССР. Лепшыя экземпляры чучала зубра будзе мець Акадэмія Навук СССР і зоолёгічны музэй Беларусі.

Беларусь набывае, такім чынам, вялікую кантоўнасьць, бо зубры ўжо павыміралі: зараз іх налічваецца толькі каля 60 ці галоў, якія жывуць у запаведніку Нямеччыны.

Здарэньні.

САМАГУБСТВА.

23 студзеня днём у доме № 82 па Савецкай вул. застрэліўся скарбнік Мэталёскладу В. Вялічка—25 год. Прычына самагубства—сямейныя спрэчкі.

ЗАТРЫМАНЬНЕ ЗЛАДЗЕЙКІ.

Крымінальны Вышук затрымаў зладзейку Ануфрэйчык, якая абакрала працалектыў „Чырвоны ткач". Ануфрэйчык некалькі раз ужо праходзіла праз крымвышук. Рэчы знойдзены.

ПАКРАЖА.

У ноч на 23 студзеня на Рэспубліканскай вуліцы № 21 праз палом замкоў была абакрадзена кладоўка жыхароў. 4-ае аддзяленьне міліцыі пакражу выкрыла. Затрыман злодзей-рэцыдывіст Рагінскі, які нядаўна быў вызвален са Спраўдому.

ЗАБОЙСТВА.

У часе п'янкі ў вёсцы Кліпок, Чэрвенскага раёну, забіты Ц. Каток 36 год. Забойца затрыман.

ЗАКОНЫ і ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб роспуску акруговых, райённых, гарадзкіх, местачковых і сельскіх выбарчых камісій у зьвязку з адкладаньнем перавыбараў.

У зьвязку з перанясьненьем перавыбараў гарадзкіх і сельскіх саветаў і скліканьня акруговых і райённых зьездаў саветаў на восень 1928 году, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **пастанаўляе:**

Створаныя акруговыя, райённыя, гарадзкія, местачковыя і сельскія выбарчыя камісіі распусьціць.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяноў.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

г. Менск. 19-I, 1928 г.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену артыкулу 23 і пра дапаўненьне артыкулам 24 „Палажэньня аб Асобнай Калегіі Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах БССР".

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Запісаць артыкул 23 „Палажэньня аб Асобнай Калегіі Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах БССР" (З. З БССР 1927 г., № 30, арт. 145) у наступнай рэдакцыі:

„23. Па прапанове Народнага Камісара Земляробства, Пракурора Рэспублікі альбо Старшыні Асобнае Калегіі Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах рашэньні судовага пасяджэньня Асобнае Калегіі Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах могуць быць перагледжаны яе Пленумам".

2. Дадаць да „Палажэньня аб Асобнай Калегіі Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах БССР" наступны артыкул:

„24. Пракурор Рэспублікі мае права апратэставаць пастанову Пленуму Асобнае Калегіі Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах, з якою ён ня згодзен, у Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР".

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяноў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

19 студзеня 1928 г.

г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

о роспуске окружных, районных, городских, местечковых и сельских избирательных комиссий в связи с перенесением перевыборов.

В связи с перенесением перевыборов городских и сельских советов и созыва окружных и районных с'ездов советов осенью 1928 г., Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

Организованные окружные, районные, городские, местечковые и сельские избирательные комиссии—распустить.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

г. Минск. 19-I—28 г.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении статьи 23 и о дополнении статьей 24 „Положения об Особой Коллегии Высшего Контроля по Земельным Делам БССР".

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Изложить статью 23 „Положения об Особой Коллегии Высшего Контроля по Земельным Делам БССР" (С. З. БССР 1927 г., № 30, ст. 145) в следующей редакции:

«23. По предложению Народного Комиссара Земледелия, Прокурора Республики или Председателя Особой Коллегии Высшего Контроля по Земельным Делам решения судебного заседания Особой Коллегии Высшего Контроля по Земельным Делам могут быть пересмотрены ее Пленумом".

2. Дополнить „Положение об Особой Коллегии Высшего Контроля по Земельным Делам БССР" следующей статьей:

„24. Прокурор Республики имеет право опротестовать постановление Пленума Особой Коллегии Высшего Контроля по Земельным Делам, с которым он не согласен, в Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР».

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР М. Галадзед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

г. Минск. 19 января 1928 г.

Апавяшчэньні.

Ц. ДОМ АЬСВЕТЫ.

— Сёньня а 7 гадз. увечары адбудзецца зачынены сход ячэйкі ЮП(б)Б працаьсьветы.

— У сераду, 25-1, а 6-й гадзіне ўвечары скліканецца сход беспартыйных членаў саюзу Белпрацаьсьветы з пэдперсаналу і іншых, маючых сярэднюю адукацыю.

Лука абавязкова.

— 25 студзеня а 8 гадзіне ў Доме асьветы адбудзецца пасяджэньне гаспадарчае камісіі шэф.—т-ва „Працаьсьветы".

Да ўсіх групкомаў, 1 і 2 мясцкомаў «Працаьсьветы» просьба выслаць сваіх прадстаўнікоў. Прысутнасьць сяброў гаспкамісіі абавязкова.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

Абавязковая пастанова № 4

МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ

21 студзеня 1928 г.

АБ БАРАЦЬБЕ З ШАЛЕНСТВАМ ЖЫВЁЛЫ Ў ГОР. МЕНСКУ.

Менскі Гарадзкі Савет постанаўляе:

1) Абавязаць гаспадароў сабак:

а) зарэгістраваць сабак у Акруговым Зямельным Аддзеле і атрымаць аб рэгістрацыі бляшаны нумар;

б) выпускаць на вуліцы сабак толькі ў намордніках і нашэйніках і з нумарам;

в)—сабак для варты двара трымаць на ланцугу, пры чым ланцуг павінен быць такой даўжыні, каб сабака не перашкаджала праходу ў памяшканьні. У тых-жа дварох, дзе сабакі ня трымаюцца на ланцугу, павінна на варотах быць вывешана абвяшчэньне аб тым, што без званка ўваход у двор забараняецца;

г) пры падозранасьці ў адносіне захваронья шаленствам сабак, кошак і іншай хатняй жывёлы, безадкладна паведамляць ветэрынарнаму пэрсаналу альбо міліцыі і адначасова да агляду ветнадзорам запіраць хворую жывёлу ў асобнае памяшканьне.

2. Сабакі, якія зьяўляюцца на вуліцы без устаноўленых знакаў і намордніках, лічацца безгаспадарчымі і падлягаюць лоўлі і ізаляцыі на тэрмін ня звыш 3-х дзён, пасьля чаго, калі ня знойдзецца гаспадар, зьнішчаюцца. У выпадку, калі гаспадар злоўленай сабакі знойдзецца, апошняя па прадстаўленьні квітанцыі аб рэгістрацыі і пры адсутнасьці перашкод з боку ветнагляду, выдаецца гаспадару з умовай трымаць яе на прывязі ня менш 3-х месяцаў.

3. Лоўлю сабак у г. Менску дазваляецца пачаць раніцой да 9 гадзін у центры гораду і да 12 гадзін на акраінах гораду, прычым у выпадку, калі сабака з вуліцы забегла ў двор, дазваляецца лавіць яе і ў двары.

4. Па распараджэньні ветнасляду, а таксама па просьбе домаўладальня ці міліцыі, лоўля бродзячых сабак можа вытварацца ў двары.

5. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на ветнагляд і міліцыю.

6. Вінаватыя ў невыкананьні гэтай абавязковай пастановы будуць карацца ў адміністрацыйным парадку штрафам да 50 руб. ці прымусовымі работамі да 2-х тыдняў.

7. Гэта абавязковая пастанова ўваходзіць у сілу праз 7 дзён пасьля абвяшчэньня яе.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету ЯЦКЕВІЧ.

Сэкратар ПАСЫНКОЎСКІ.

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Серада, 25 студзеня.

„СОН У ЛЕТНЮЮ НОЧ". Камэдыя ў 3-х дзеях.

нядзеля, 29 студзеня,

„Каля тэрасы". Народн. драма ў 4-х дзеях з час. 1917 году

ПАЧАТАК А 8 З ПАЛ. ГАДЗ. ВЕЧАРА.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА»

МАСТАЦКАЯ БЫТАВАЯ ФІЛЬМА „УХАБЫ".

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—ХРОНІКА СОВКІНО № 110.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".

З аўторка, 24-га студзеня—

СУСЬВЕТНЫ БАЯВІК—ШЭДЭЎР КІНО-ТЭХНІКІ І МАСТАЦТВА

„ВАР'ЕТЭ".

Трагедыя ў 7-х частках.

Штодня—4 сэансы. Цэны звычайныя.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».

„СУМКА ДИПКУР'ЕРА.

Драма ў 7-х частках.

Пачатак сэансаў у 6, 7 з пал., 9 і 10 з пал. гадз. увечары.

АНОНС! Хутка „Шостая частка сьвету".

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".

ДУГЛАС ФЭРБЭНКС, МЭРЫ ПІКФОРД І ІГАР ІЛЬІНСКІ Ў ВЫДАТНАЙ ФІЛЬМЕ

„ПОЦЕЛУЙ МЭРИ".

Звыш праграмы—гастроль артыста маскоўскай і ленінградзкай эстрады Е. А. МУРАТАВА.

ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ, рассылаецца падпісчыкам і паступае ў продаж (у кіёсках контр-агенцтвадруку, чарговы нумар і часопісу

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"

пад рэдакцыяй тав. КНОРЫНА—студзень 1928 г. (Орган ЦК КП(б)Б)

ЗЬМЕСТ.

1. В. КНОРЫН. Новая полоса; 2. ВЫДРА. Ленин и революционизирование крестьянского хозяйства; 3. А. СЯНЬКЕВІЧ. Палітычныя групоўкі ў Заходняй Беларусі перад выбарамі ў польскі сойм; 4. П. ТОНОПЛИН. Австрийский фашизм и банкротство австро-марксизма; 5. С. КАМЕНШТЕЙН. На путях оживления советов; 6. О. КАНАКОЦІН. Судовыя аддзелы нашых газэт; 7. М. Ш. Г. О проработке вопросов XУ-го с'езда ВКП(б) и XI с'езда КПБ.

НА МЯСЦОХ.

СУХАРЕВ. Проверка работы по выдвижению. МАЛАШЕНКО. Анти религиозная пропаганда и трудовая интеллигенция.

ПАРТЫЙНАЯ ХРОНІКА.

У Ц.К. К.П.(б)Б.

Задачы партыі ў галіне тэатральнай палітыкі (пастанова Сэкратарыяту ЦК КП